

КУДЫ ЛЯЦІЦЬ «СТРАЛА» 4

ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ ПРАБЛЕМ З ПАЗВАНОЧНІКАМ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родпай мове

# ЗВЯЗДА

23 СНЕЖНЯ 2020 г. СЕРАДА № 250 (29364)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена КУХАРЭВІЧ, першы намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта:**

*«Сёння мы не ўяўляем жыцця без розных гаджэтаў і мабільнай сувязі — гэта не толькі даніна модзе, але і асноўнае патрабаванне сучаснага свету. У Беларусі ў параўнанні з 2015 годам на 50 % вырасла колькасць абанентаў бесправаднога шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт, актыўна развіваюцца інавацыйныя навукова-тэхналагічныя структуры: «Вялікі камень», Парк высокіх тэхналогій, НАН Беларусі. Па колькасці даследчыкаў на мільён жыхароў рэспубліка займае другое месца сярод краін СНД, саступаючы толькі Расійскай Федэрацыі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «КРАІНА БУДЗЕ ЗАБЯСПЕЧАНА ВАКЦЫНАЙ, І КОЖНЫ ЖАДАЮЧЫ ЗМОЖА МЕЦЬ ДА ЯЕ СВАБОДНЫ ДОСТУП»



Фота БелТА.

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях распрацоўкі ўласных і вытворчасці замежных вакцын**

**Як расказаў кіраўнік краіны, зараз адпрацоўваюцца тры магчымыя тэхналогіі атрымання прататыпа вакцыны, вывучаецца дынаміка стану імунітэту ў пацыентаў пасля перанесенай пнеўманіі, выкліканай каранавірусам, а таксама аспекты захавання імуннага адказу арганізма.**

**«Гэта дапаможа выбраць асноўную мішэнь для стварэння айчыннай вакцыны. Паралельна адпрацоўваецца тэхналагічны працэс і ідзе пошук пастаўшчыкоў для закупкі неабходнага для гэтага абсталявання», — паведаміў Прэзідэнт.**

Другі падыход заключаецца ў лакалізацыі замежных распрацовак. Беларускі лідар пацікавіўся ў спецыялістаў, якія дэталі ўжо вывучаны і прапрацаваны — тэрміны, аб'ёмы, крыніцы фінансавання і перспектыўныя магчымасці па стварэнні вакцыны, і на якім этапе знаходзіцца сумесны праект холдынга «Белфармпрам» і расійскага Нацыянальнага даследчага цэнтра імя Гамалеі.

СТАР. 2

# Як было ў Віфліеме...

Упершыню ў каталіцкай парафіі Святога Яна, што ў сталічнай Серабранцы, святое Калляднае набажэнства пройдзе ў недабудаваным храме, а не ў капліцы з-за пандэміі, бо вялікая касцельная плошча дае магчымасць змясціць усіх жадаючых на бяспечнай адлегласці. Як і ў мінулыя святы, учора на ўбранні ёлкі, касцельных памяшканняў і традыцыйнай батлеечнай інсталяцыі былі занятыя закарыстыян Калікст ШЫМУК *(на фота злева)*, які ўжо дваццаць пяць гадоў прыслужвае на набажэнствах і заўсёды спрыяе нашай газеце ў падрыхтоўцы фотапублікацый, а таксама актыўны і надзейны парафіянін, пенсіянер Анатоль СУШКО. На здымку гэтыя руплівцы, па хрысціянскай завядзёнцы, усталёўваюць фігуркі ў «Віфліемскім стойле» паводле гісторыі Божага Нараджэння.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



## КОРАТКА

- **«Белпошта» пачала датэрміновую выплату пенсій за 25 снежня.**
- Месячная мінімальная заработная плата ў Беларусі з 1 студзеня 2021 года ўстанаўліваецца ў памеры Br400.
- **Тры беларускія прадпрыемствы ўдастоены прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці.**
- БелАЭС выдадзены дазвол на доследна-прамысловую эксплуатацыю першага энергаблока.
- **У 2021—2025 гадах 309 розных аб'ектаў Віцебскай вобласці, у тым ліку сацыяльна значных, абсталююць комплексным безбар'ерным асяроддзем.**



Энергетыка

# Што атрымаюць беларусы ад АЭС у 2021-м

## Электрычнае жыллё, лічбавая падстанцыя і новыя тарыфы



**Новыя тарыфы на электраэнергію і пашырэнне сфер яе выкарыстання насельніцтвам, магчымасці будаўніцтва ў Беларусі другой АЭС і газіфікацыя ўсіх населеных пунктаў краіны. Гэтыя і іншыя планы, магчымасці і дасягненні энергасістэмы краіны абмяркоўвалі спецыялісты падчас прэс-канферэнцыі напярэдадні Дня энергетыка.**

СТАР. 3

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы




ISSN 1990 — 763X

20250

# «КРАІНА БУДЗЕ ЗАБЯСПЕЧАНА ВАКЦЫНАЙ, І КОЖНЫ ЖАДАЮЧЫ ЗМОЖА МЕЦЬ ДА ЯЕ СВАБОДНЫ ДОСТУП»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Аднак незалежна ад таго, выйдзем мы на вытворчасць вакцыны ў разумныя тэрміны ці не, хачу, каб грамадства ведала: ***краіна будзе забяспечана вакцынай, і кожны жадаючы зможа мець да яе свабодны доступ»***, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт Беларусі.

У першую чаргу, як паведаміў Аляксандр Лукашэнка, прышчэпяць самыя неабароненыя слаі насельніцтва — пажылых, медыцынскіх работнікаў, настаўнікаў, работнікаў гандлю. ***«Для гэтага мы заўсёды знойдзем сродкі»***, — заўважыў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка краіны, увага ўсяго свету сёння засяроджана на адной праблеме — ліквідацыі ўспышкі пандэміі COVID-19, і для гэтага ва ўсіх краінах прымаюцца беспрэцэдэнтныя меры. І, зразумела, Беларусь, абазначыў Аляксандр Лукашэнка, не выключэнне: «Спакойна, як мае быць, захаваўшы сістэму аховы здароўя, змагаемся з гэтай заразай».

Як дадаў Прэзідэнт, у апошнія два тыдні рэгулярна разглядаюцца пытанні арганізацыі выяўлення і лячэння ў нашай краіне хворых з каранавіруснай інфекцыяй.

«Я запрасіў вас для таго, каб абмеркаваць наступны этап супрацьстаяння глабальнай хваробе — масавую вакцынацыю насельніцтва ў мэтах выпрацоўкі так званага калектыўнага імунітэту. У «гонку вакцын» сёння актыўна ўключыліся амаль усе краіны — ідзе распрацоўка каля 200 патэнцыйных прэпаратаў. Штодня гучаць заявы пра поспехі, і тут жа з'яўляюцца інфармацыйныя выкрыцці», — адзначыў Прэзідэнт.

На яго думку, пытанне здароўя і жыццяў людзей пераходзіць у камерцыйную плоскасць, краіны, якія валодаюць неабходным навуковым і вытворчым патэнцыялам, у пытанні стварэння і вырабу вакцын у першую чаргу ўлічваюць свае патрэбы і палітычныя прыярытэты.

«Пры неспрыяльным развіцці падзей граніцы ўмомант зачыняюцца, а вываз біятэхналагічнай прадукцыі, вырабаў медыцынскага прызначэння і спецыяльнага абсталявання блакіруецца. ***Сусветная супольнасць і міжнародныя арганізацыі пакуль не могуць прапанаваць дзейсных інструментаў аднаўлення сапраўднай справядлівасці і чалавечнасці ў гэтым пытанні»***, — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Па яго інфармацыі, маштабная вакцынацыя пачынаецца толькі ў некаторых краінах — таму абмеркавалі, як плануецца вырашаць гэтае пытанне ў Беларусі.

Варыянтаў, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, няшмат — першы заключаецца ў распрацоўцы ўласных, беларускіх вакцын.

Прэзідэнт разумее, што, магчыма, нешта ў гэтым плане не атрымаецца, але важны вопыт, які напрацуем. Дый ніхто не гарантуе, што ў гэтым ці наступны годзе каранавірус сыдзе ад нас назаўсёды.

***«Ёсць вучоныя, ёсць напрацоўкі, ёсць школа. Трэба гэтым займацца.*** На што выйдзем, я сёння хачу вас паслухаць, каб дарэмна не траціць грошы. Таму ўласнымі, беларускімі вакцынамі займацца будзем», — заявіў Прэзідэнт.

Вытворчасць імунабіялагічных прэпаратаў такога ўзроўню, на думку Прэзідэнта, — гэта абсалютна новая для нашай краіны задача, але ў свеце вопыт вялікі і яго трэба вывучаць.

«Уласных распрацовак у нас няма, і вакцыны закупляюцца ў замежных вытворцаў. Як я ўжо сказаў, ёсць пэўны патэнцыял і ў вас, у Міністэрстве аховы здароўя і Акадэміі навук. І, як мне дакладваюць, на рашэнне гэтай задачы ўжо нацэлены вядучыя супрацоўнікі і навукоўцы ў сферах вірусалогіі, імуналогіі, генетыкі і клетачнай інжынерыі», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: каб выбраць найбольш характэрны штам віруса для вытворчасці вакцыны, вывучана генетычная разнастайнасць яго варыянтаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## У тэму

**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя,** расказаў журналістам, што амаль па ўсіх рэгіёнах ёсць невялікая тэндэнцыя да змяншэння захваральнасці на каранавірусную інфекцыю.

«Сёння ёсць аптымістычныя даныя, што некаторыя медустановы пераходзяць на рэжым звычайнай сістэмы працы — гэта ў Брэсцкім і Віцебскім рэгіёне», — канстатаваў міністр.

Па яго словах, вакцынацыя насельніцтва — найважнейшы кампанент у барацьбе з эпідэмічнымі працэсамі. Да канца вясны новага года плануюць прышчапіць ад каранавіруса каля 1 мільёна 200 тысяч чалавек, а пасля выйсці на 5-5,5 мільёна прышчэпленых.

На нарадзе ў Прэзідэнта, нагадаў міністр, абмяркоўваліся шляхі развіцця масавай імунізацыі краіны ад ковіда. Адзін з іх — стварэнне айчыннай вакцыны.

«Сёння прааналізаваны магчымасці нашых навуковых арганізацый не толькі ў стварэнні вакцыны, колькі ў яе маштабаванні. Гэта вельмі складаны працэс, і сёння мы гэты ланцужок вывелі», — паведаміў Дзмітрый Піневіч.

Другі кампанент — лакалізацыя замежных вакцын на айчыннай вытворчасці. На нарадзе вызначылі пляцоўкі, дзе будзе маштабавацца вакцына, у першую чаргу расійская. «Пры гэтым на большасці пляцовак мы не будзем траціць дзяржаўныя рэсурсы. Гэта будуць бізнес-праекты, якія маюць сваёй мэтай насычэнне бяспечнымі вакцынамі нашай краіны і магчымыя экспартныя пастаўкі ў будучым», — сказаў кіраўнік ведамства.

**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН,** паведаміў, што ў Акадэміі навук дзейнічае група па распрацоўцы айчыннай вакцыны. У яе ўвайшлі 15 чалавек — вучоныя і прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя.

«Сёння праводзяцца даследаванні і вывучэнне замежнага вопыту. Мы мяркуем, што зможам выйсці на прататып нашай беларускай вакцыны да канца 2021-га — сярэдзіны 2022 года», — заявіў Уладзімір Гусакоў.

**Ігар СТОМА, рэктар Гомельскага медуніверсітэта,** адзначыў, што сёння краіны свету змагаюцца за магчымасць маштабаваць вытворчасць вакцын.

«Мы бачым, наколькі павышаны запыт на вакцыну ад COVID-19. Вельмі важна разумець, што Беларусь таксама павінна быць у спісе краін, што ў стане маштабаваць і распрацаваць вакцыну», — падкрэсліў рэктар.

Па яго словах, створаная вакцына ад каранавіруса будзе патрабаваць пастаяннай дапрацоўкі, каб яе эфектыўнасць не зніжалася. Таму неабходна займець і сваю навуковую школу, здольную не толькі ствараць, але і адаптаваць прэпарат.

**Сяргей КАЗАКЕВІЧ, генеральны дырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Белфармпрам»,** паведаміў, што налета на некалькіх пляцоўках у рэспубліцы арганізуюць вытворчасць вакцыны.

«Закупка вакцын ідзе з розных крыніц і ад розных вытворцаў, што датычыцца лакалізацыі — у нас сёння ў найбольшай ступені прапрацоўкі пытанне лакалізацыі расійскай вакцыны «Спадарожнік V», — сказаў спецыяліст.

Вытворчасць мяркуюць наладзіць на трох пляцоўках: дзве з іх у Мінску і адна ў Віцебску. Яны пачнуць працаваць адна за адной: першая — у другім квартале 2021 года, наступная — пасля завяршэння трэцяга квартала і апошняя — у канцы года.

Па словах Сяргея Казакевіча, прыйдзецца значна даабсталяваць вытворчасці пад вакцыну.

«Фармацэўтычныя прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь да сённяшняга часу маштабнай прамысловай вытворчасці вакцын не мелі. Гэта новая для нас вытворчасць. Мы ўдзячныя расійскім партнёрам, што яны разам з намі ўступяць у гэтыя праекты. Мы атрымаем вопыт, тэхналогіі і далей зможам рэалізоўваць больш маштабныя праекты ў гэтай сферы», — дадаў генеральны дырэктар.

**Сяргей БАЛЬШАКОЎ, дырэктар «БелВітуніфарм»,** расказаў журналістам, што на прадпрыемстве наладзяць вытворчасць расійскай вакцыны, а паралельна будуць працаваць з навукоўцамі над айчыннай вакцынай ад каранавіруса.

«Што датычыцца вытворчасці, мы ў кароткія тэрміны будзем арганізоўваць яе і зробім так, каб усё адпавядала сусветнаму ўзроўню якасці, — сказаў суразмоўнік. — Наш вопыт дазваляе сказаць, што аб'ём вытворчасці будзе нарошчаны ў наступным годзе, і мы зможам пачаць прамысловую вытворчасць».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Каранавірус дабраўся да Антарктыды



Антарктыда перастала быць адзіным кантынентам, вольным ад ковіда, паведаміла аўстралійская тэлекампанія ABC. На чылійскай даследчай базе O'Higgins Riquelme 36 чалавек атрымалі станоўчыя тэсты на COVID-19. На станцыю накіравалі новую каманду, якая прайшла папярэдні каранцін і здала адмоўныя тэсты. ВМС Чылі таксама паведамілі, што тры члены экіпажа судна, якое займаецца транспартным абслугоўваннем базы O'Higgins, па вяртанні з Антарктыкі атрымалі станоўчыя вынікі на COVID-19. Перад гэтым рэйсам тэсты ўсёй каманды былі адмоўныя. Як вядома, O'Higgins — адна з 13 дзеючых чылійскіх баз у Антарктыдзе. Яна знаходзіцца непадалёк ад самай паўночнай кропкі антарктычнага паўвострава, бліжэй да мыса Горн. Тэлеканал ABC адзначыў, што да яе цяжка дабраўся навват па мерках Антарктыды.

### Кангрэс ЗША ўхваліў пакет дапамогі эканоміцы на $900 мільярдаў

Таксама ўзгоднена выдаткаванне 1,4 трыльёна долараў на фінансаванне ўрада, паведаміла агенцтва Bloomberg. Дакумент прадугледжвае выдзяленне сродкаў на барацьбу з каранавірусам, фінансавую дапамогу фізічным і юрыдычным асобам, субсідыі сур'ёзна пацярпелым прадпрыемствам, рэстаранам і тэатрам, фінансаванне школ, медыцынскіх устаноў. Bloomberg адзначае, што спрэчкі паміж прадстаўнікамі Дэмакратычнай і Рэспубліканскай партый у Кангрэсе па пытанні аб новым пакеце фінансавай дапамогі эканоміцы ішлі каля дзевяці месяцаў. Дэмакраты ў маі настойвалі на выдзяленні значна большай сумы — $3,4 трыльёна, аднак да кастрычніка знізілі патрабаванні да $2,4 трыльёна.

### Кітай запусціў найноўшую ракету з сакрэтным спадарожнікам

Кітайская ракета сярэдняга класа «Чанчжэн-8» («Вялікі паход-8», CZ-8) стартавала з сакрэтным спадарожнікам XJY-7 і групай касмічных мікраапаратаў. Прамая трансляцыя вялася на кітайскім сайце DouYu. Гэта першы палёт найноўшай кітайскай ракеты. Запуск быў ажыццёўлены з касмадрома Вэньчан на востраве Хайнань. У перспектыве першую прыступку новай ракеты з бакавымі паскаральнікамі ў варыянце «Чанчжэн-8R» плануецца адаптаваць для шматразовага выкарыстання. Яна павінна будзе пасля старту ракеты ажыццяўляць кіруемую вертыкальную пасадку на марскую платформу. «Чанчжэн-8» павінна стаць асновай носьбіта шматразовага выкарыстання для камерцыйных запускаў.

## Будзь у курсе!

# Парадак размеркавання ўдасканальваецца

**Пастановай Савета Міністраў унесены змяненні ў Палажэнне аб парадку размеркавання, пераразмеркавання, накіравання на працу, наступнага накіравання на працу выпускнікоў, якія атрымалі пасляўніверсітэцкую, вышэйшую, сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную адукацыю. Адпаведны дакумент апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Сярод новаўвядзенняў варта адзначыць удакладненне катэгорый выпускнікоў, якія маюць першачарговае права выбару месца працы на размеркаванні (у дадзены пералік уключаны выпускнікі, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве), а таксама парадку дзеянняў выпускнікоў, якія атрымалі пасведчанне аб накіраванні на працу і былі прызваныя або добраахвотна паступілі на ваенную службу па кантракце ва Узброеныя Сілы.

Дакументам устанаўліваюцца крытэрыі дасягнення студэнтамі і навучэнцамі высокіх вынікаў у вучобе і высокіх паказчыкаў у грамадскай рабоце і навукова-даследчай дзейнасці; увядзенне абавязку дзяржорганаў і наймальнікаў па прынцыпе мер ствараць неабходныя ўмовы для замацавання на рабочых месцах маладых спецыялістаў (рабочых); карэкціроўка норм, якія рэгулююць пытанні прыёму на працу маладых спецыялістаў, залічэння асоб на больш высокі ўзровень адукацыі і іншыя пытанні.

Пастановай таксама прадугледжана карэкціроўка Палажэння аб парадку пакрыцця ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, выдатканых дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, спецыяліста, рабочага, служачага.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства адукацыі, прававым актам удакладняецца парадак добраахвотнага вяртання выдаткаваных дзяржавай на падрыхтоўку сродкаў пры адмове ад працы па размеркаванні, алгарытм дзеянняў у выпадку непрыбыцця выпускніка на месца працы і механізм выдачы даведкі аб самастойным працаўладкаванні асобам, якія не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін, добраахвотна паступілі на ваенную службу па кантракце ва Узброеныя Сілы і звольненым з яе.

Акрамя таго, дакументам устаноўлены адзіны падыход у вызначэнні неадпрацаванага тэрміну, у адпаведнасці з якім выпускнікам разлічваецца памер сродкаў, што падлягаюць кампенсацыі ў бюджэт.

Пастанова ўступае ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Слова — чытачам

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

# «АСОБНЫ «ЛАЙК» — ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ»



**Марына СЛУЦКАЯ — двухразовая чэмпіёнка Еўропы, чэмпіёнка Еўрапейскіх гульняў, васьміразовая чэмпіёнка Беларусі. Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь.**

«Задачы спартсмена — гэта не толькі заваяванне медалёў і перамога на спаборніцтвах, але і папулярызацыя свайго спорту. Асабіста мне вельмі хочацца, каб маім любімым дзюдо цікавілася як мага больш людзей. Усё, што ад мяне залежыць, я раблю ў сваім блогу і ў сваіх інтэрв'ю для сродкаў масавай інфармацыі. Таму лічу «Звязду» добрым памочнікам і сябрам. Упэўнена: я не адна такая. Не буду крывіць душой і скажу, што заўсёды прыемна расказваць сваю гісторыю, дзяліцца думкамі на старонках такой адметнай газеты, як «Звязда», і такім чынам мець зносіны з разнастайнай цікавай аўдыторыяй.

Асобны «лайк» хацелася б паставіць «Звяздзе» за беларускую мову. На жаль, мы не часта карыстаемся ёй у паўсядзённым жыцці, але не ведаць ці забываць яе нельга. Асабліва спартсменам, якія прадстаўляюць краіну на міжнародных турнірах. Дзякуй, «Звязда», за тое, што засцерагаеш нас ад забыцця.

У новым 2021 годзе я жадаю «Звяздзе» важных актуальных тэм з удзелам цікавых герояў, плённай працы і па-свойму «алімпійскіх» перамог».

# Што атрымаюць беларусы ад АЭС у 2021-м

## Першы рэактар ізноў працуе

Сваю асноўную задачу — надзейнае і беспярэбойнае забеспячэнне спажыўцоў электрычнай цеплаэнергіяй, трэверным звадкаваным газам, цвёрдым палівам — энергетыкі сёлета выканалі, упэўнены **міністр энергетыкі краіны Віктар КАРАНКЕВІЧ:**

*— Спажыванне электраэнергіі ў краіне па выніках года чакаецца ў аб'ёме каля 37,9 млрд кВт·г, а гэта практычна ўзровень мінулага года.*

Бягучы год адзначыўся рэалізацыяй буйных інвестыцыйных праектаў, найважнейшы з якіх — будаўніцтва АЭС. Першы энергаблок станцыі гатовы на 99 %. 21 снежня на ім завяршыўся этап энергетычнага пуску, падчас якога выкананы 246 выпрабаванняў, у тым ліку рэжым скідвання нагрузкі турбагенератара энергаблока з 500 МВт да нуля (адключэнне рэактара). Увечары 21 снежня турбагенератар першага энергаблока зноў падключылі да энергасістэмы.

У найбліжэйшы час пачнецца этап яго доследна-прамысловай эксплуатацыі, расказаў ён:

*— У межах гэтага этапу плануецца павелічэнне магутнасці рэактара з 50 % да 100 % і асваенне магутнасці турбагенератара з 500 МВт да 1190 МВт — яго намінальнай магутнасці.*

За гэты час будуць праведзены неабходныя выпрабаванні, у тым ліку скідванне нагрузкі турбагенератара да нуля. Пасля іх паспяховага заканчэння правядуць комплекснае выпрабаванне энергаблока працягласцю 15 сутак на намінальнай магутнасці, пасля чаго першы энергаблок будзе прыняты ў эксплуатацыю, паабяцалі энергетыкі.

Будаўніча-мантажныя работы на другім энергаблоку выкананы на 75 %. Цяпер тут манціруецца асноўнае абсталяванне, тэхналагічныя трубапроводы, пракладваецца кабель. Тэрміны ўводу станцыі ў эксплуатацыю запланаваны ў 2021-м (першы энергаблок), першае паўгоддзе 2022-га (другі энергаблок).

Адносна планаў будаўніцтва ў краіне другой АЭС міністр заўважыў: «Вядзецца работа над матэрыяламі, задзейнічаны адпаведныя органы дзяржкіравання. Гэтую работу плануецца выконваць на працягу 2021 года».

## Стымуляцыя рублём

Каб стымуляваць павелічэнне спажывання электраэнергіі ў краіне, летась уведзены новыя тарыфныя групы на электраэнергію для насельніцтва для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння, нагадаў Віктар Каранкевіч. Па інфармацыі на лістапад 2020-га, больш за 10 тысяч абанентаў перайшло на разлікі па гэтых тарыфах, а спажыванне электраэнергіі пры гэтым узрасло за 11 месяцаў у параўнанні з мінулагоднім у восем разоў і склала 65 млн кВт·г.

Рыхтуецца комплексная праграма па павелічэнні выкарыстання электраэнергіі насельніцтвам на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне.

*— Мы планавалі сёлета цалкам сфарміраваць яе і ўвязаць з рэалізацыяй дзяржпраграм «Будаўніцтва жылля» і «Камфортнае жыллё» ў часткі рэканструкцыі электрасетак у сельскай мясцовасці, а ў пачатку 2021-га прыняць яе непасрэдна да рэалізацыі,* — падзяліўся міністр.

Праграма мае тры асноўныя кірункі.

**Будаўніцтва электрасеткавай інфраструктуры да новага жылля: шматкватэрнага і індывідуальнага.** Сёлета ўведзена ў эксплуатацыю каля 33 тысяч м² такога жылля.

**Перавод шматкватэрнага жыллёвага фонду, дзе для ацяплення выкарыстоўваецца цвёрдае паліва, на электраэнергію.** Ужо сфарміраваны дакладны пералік 85 такіх дамоў, на мадэрнізацыю атрымана згода іх жыхароў. За наступныя пяць гадоў гэта рэалізуюць.

**Перавод індывідуальных жылых дамоў (у асноўным на вёсцы) на выкарыстанне электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння.** У 2020-м ад грамадзян паступіла 22,4 тысячы заявак аб выдачы тэхнічных умоў на далучэнне электраўстановак адпаведных жылых дамоў да электрасетак для выкарыстання электраэнергіі на ацяпленне, гарачае водазабеспячэнне і гатаванне ежы. 80 % з іх задаволены. *«Тых, хто не змог атрымаць тэхумовы, уключаюць у перспектыўныя планы рэканструкцыі электрасетак»,* — удакладніў міністр.

З 1 студзеня 2021 года плануецца новы тарыфны план для энергаёмістых вытворчасцяў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання электраэнергіі. Мяркуецца выдзеліць шэсць груп вытворчасцяў. Тарыфы для іх будуць дыферэнцыравацца па прынцыпе «чым большы аб'ём спажывання, тым ніжэйшы кошт электраэнергіі».

А ў канцы 2021-га ў краіне павінна з'явіцца першая лічбавая «Падстанцыя «Магілёў-330». Гэты праект ужо актыўна рэалізоўваецца.

**Ірына СІДАРОК.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Акцэнты

# Выбудоўваць адносіны трэба на аснове дыялогу і ўзаемапавагі

**Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і яе членскія арганізацыі прынялі заяву аб парушэнні Еўрапейскім саюзам правоў працоўных Беларусі.**

— Увядзенне эканамічных санкцый у дачыненні да беларускіх прадпрыемстваў — гэта ў першую чаргу санкцыі ў дачыненні да работнікаў. Гэта ўшчамленне асноватворнага права чалавека — права на працу, — гаворыцца ў заяве. — Абмежаванне дзейнасці прадпрыемстваў у сувязі з увядзеннем санкцый можа прывесці да зніжэння заработнай платы, скарачэння рабочых месцаў, у цэлым да пагаршэння сацыяльна-эканамічнага становішча не толькі саміх работнікаў прадпрыемстваў, але і іх сем'яў.

Як падкрэслілі ў нацыянальным прафцэнтры, ААН прызнала, што санкцыі амаль заўсёды аказваюць сур'ёзнае ўздзеянне на эканамічныя інтарэсы звычайных людзей і ўшчамляюць правы на працу. Больш за тое, яшчэ ў 2019 годзе спецыяльны дакладчык ААН па пытаннях негатыўнага ўздзеяння аднабаковых прымусовых мер на правы і свабоды заявіў аб тым, што выкарыстанне эканамічных санкцый у палітычных мэтах з'яўляецца парушэннем правоў чалавека і падрывае асновы міжнароднага супрацоўніцтва. Сёлета ва ўмовах пандэміі ў ААН заклікалі адмовіцца ад эканамічных санкцый, каб краіны мелі больш магчымасцяў для падтрымкі сістэм аховы здароўя і дапамогі людзям.

ФПБ і яе членскія арганізацыі выступаюць з рашучым пратэстам у сувязі з прыняццем Еўрапейскім саюзам рашэння аб увядзенні эканамічных санкцый у адносінах да асобных беларускіх прадпрыемстваў. І маюць намер абараняць правы людзей працаваць без абмежаванняў і штучных бар'ераў, створаных па абсалютна бяздоказных падставах, сцвярджаецца ў заяве.

— Эканамічныя санкцыі ў рэшце рэшт заўсёды адбіваюцца менавіта на работніках прадпрыемстваў. Гэтыя дзеянні накіраваны на тое, каб нанесці шкоду дабрабыту людзей, пазбавіць іх заробку, а магчыма, і рабочых месцаў. Гэта значыць, фактычна ўшчамляецца права чалавека на працу, — пракаментаваў заяву **старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА.**

Ён адзначыў, што нацыянальны прафцэнтр будзе абараняць членаў прафсаюза. Салідарную падтрымку работнікам гэтых прадпрыемстваў ужо выказалі галіновыя прафсаюзы, якія ўваходзяць у структуру ФПБ.

— Таксама мы заклікаем калег па прафсаюзным руху з іншых краін падтрымаць нашу пазіцыю, накіраваную супраць выкарыстання Еўрапейскім саюзам мер, якія пагаршаюць становішча працоўных. Калі спатрэбіцца, мы будзем аказваць працоўным і іх сем'ям матэрыяльную падтрымку з дзеючых прафсаюзных кас узаемадапамогі, — падкрэсліў старшыня ФПБ.

Адзіным выхадам са становішча, якое склалася, Федэрацыя прафсаюзаў бачыць устанаўленне сяброўскіх, партнёрскіх адносін Беларусі і Еўрасаюза. І выбудоўваць гэтыя адносіны трэба на аснове дыялогу і ўзаемапавагі, падкрэсліваецца ў прынятым дакуменце.

Тэхналогіі

# «Заправіць» электракар за чатыры хвіліны

Malanka плануе будаўніцтва вельмі хуткіх станцый ужо ў наступным годзе




**Задачы па фарміраванні сеткі Malanka у гэтым годзе выкананы, а ў 2021-м чакаецца 150 новых электразаправак у Мінску і абласцях, пачнецца будаўніцтва вельмі хуткіх ЭЗС. Днямі прадстаўнікі «Беларуснафты» падвялі вынікі і расказалі пра планы на будучыню, якія датычацца развіцця зараднай інфраструктуры для электрааўтамабіляў у краіне.**

## Было 400, а стала 1600

Гэты год быў цяжкі. Барацьба з COVID-19 істотна паўплывала на сусветны рынак, перазагрузка прамысловага сектара ўнесла карэктывы ў жыцці многіх людзей, але... Негатыўныя тэндэнцыі на транспартным рынку аказалі мінімальны ўплыў на электрамабілі. Менавіта сёлета ў Еўропе колькасць продажаў электракараў за апошнія 2—3 месяцы перавышае дызельны транспарт.

У выніку новых тэндэнцый Вялікабрытанія ссунула дату адмовы ад продажаў транспарту з рухавіком унутранага згарання на 2030 год. Кітай абмяркоўвае аналагічнае рашэнне тэрмінам да 2035 года.

**Намеснік дырэктара ВА «Беларуснафта» Андрэй КОЦІК лічыць,** што наша краіна не застаецца ў баку ад глабальнага трэнду. Раней у нас быў прыняты ўказ, які стымулюе развіццё электратранспарту. На дарогах сур'ёзна ўзрасла колькасць электрамабіляў. Сёння гэта відаць па колькасці зарадных сесій і электраэнергіі, якая адпускаецца ў электрасеткі Malanka. Таму прагноз у сто тысяч электрамабіляў на нашых дарогах да 2025 года — рэальнасць.

Калі ў чэрвені гэтага года ў краіне было 400 электрамабіляў, то пасля адмены мытнай пошліны і ПДВ іх стала больш за 1600. Спецыялісты «Беларуснафты» прагназуюць, што да 1 студзеня 2021 года колькасць электрамабіляў у краіне складзе каля 2000 адзінак. Разам з тым больш стане і электразарадных станцый.

## Амаль як з бензінам, толькі ў разы танней

Такім чынам, вырашана. У наступным годзе сетка ЭЗС Malanka павялічыцца да 600 электразаправак. Прычым з'явяцца станцыі не толькі ў сталіцы і на галоўных магістралях краіны, але і ва ўсіх абласцях Беларусі. Усяго ў рэгіёнах установяць каля 80 новых станцый хуткага тыпу.

Патанненне электрамабіляў, якое будзе працягвацца і ў наступным годзе, павысіць попыт на паслугі зарадкі. Эфектыўнае і камфортнае развіццё сеткі сёння патрабуе інвестыцый. У сувязі з гэтым Андрэй Коцік нагадаў, што ў новым годзе запраўка на ЭЗС Malanka стане платнай.

На дадзеным этапе сетка Malanka знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці, і з 1 студзеня платныя зарадныя сесіі будуць запушчаны. Пры гэтым узровень тарыфаў будзе заставацца самым нізкім у Еўропе: 39 капеек за кВт/г на хуткай зараднай станцыі і 29 капеек — на павольнай. Гэты неабходны мінімум, які дазволіць забяспечыць развіццё сеткі і зручную цану для ўладальніка электракара. Заараджаць электракар будзе ў два разы танней, чым запраўляць аўтамабіль звычайным палівам.

Malanka — не манапаліст на рынку. Развіццё сеткі электразаправак пойдзе на карысць як кіроўцам, так і прадпрымальнікам, таму што простыя павольныя запраўкі могуць стаць дадатковай крыніцай іх даходаў, удакладніў намеснік дырэктара ВА «Беларуснафта».

## Аўтобусы адыходзяць на задні план

У апошні час на розных узроўнях абмяркоўваецца перспектыва замены аўтобуснага парку на электрычны, у сувязі з чым Malanka будзе развіваць зарадную сетку таксама для грамадскага электратранспарту. Гэта будуць зарадныя станцыі магутнасцю да 350 кВт, якія аснашчаны дадатковым абсталяваннем для зарадкі менавіта электробусаў.

Акрамя гэтага, Malanka сумесна з ПРААН і Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя распрацавала канцэпцыю праекта па прасоўванні электрамабіляў у Беларусі. У яго рамках плануецца ўстанавіць дзве першыя суперхуткія станцыі магутнасцю да 350 кВт.

«Электракары з кожным годам удасканальваюцца, ёмістасць акумулятараў павялічваецца. Калі яшчэ два гады таму здавалася, што ёмістасць у 40 кВт/г — гэта шмат, то сёння па беларускіх дарогах ездзяць электракары з батарэямі магутнасцю 60, 75, а то і 85 кВт/г. Упершыню ў 2020 годзе беларускія кіроўцы сярод эканамічных і больш магутных электракараў выбралі тыя, якія здольныя на адной зарадцы праязджаць 300—400 кіламетраў.

Паводле нашых прагнозаў, масавы сегмент электрамабіляў будзе здольны прымаць такі зарад праз 2—4 гады. Адпаведна, наша задача на найбліжэйшую будучыню — забяспечыць магчымасць кіроўцам ажыццяўляць зарадку батарэй электракараў за час, раўназначны таму, які вадзіцелі выдаткоўваюць на звычайную запраўку на АЗС. Да таго ж для многіх вадзіцеляў доўгі працэс зарадкі быў аргументам не на карысць электракара. З увядзеннем суперхуткіх ЭЗС папоўніць зарад батарэі на 300 кіламетраў кіроўцы змогуць усяго за чатыры хвіліны», — расказаў **начальнік аддзела эксплуатацыі зараднай інфраструктуры ВА «Беларуснафта» Максім СУСАРЭНКА.**

Будаўніцтва станцый плануецца пачаць ужо ў наступным годзе. У Мінскім комплексе з дзвюх вельмі хуткіх ЭЗС з'явіцца на вуліцы Убарэвіча. Месца размяшчэння станцый «закрые» як гарадскія, так і транзітныя патокі, акрамя таго, на гэтых «падзарадках» будзе зручна ў перспектыве зараджаць і грузавыя электрамабілі да 10 тон.

**Сяргей КУРКАЧ.**

На варце

# КУДЫ ЛЯЦІЦЬ «СТРАЛА»?

**Дзейнасць гэтага спецыяльнага падраздзялення недасведчаны чалавек заўважае рэдка. Часцей за ўсё экіпажы ДАІ мы бачым, калі яны разбіраюць дарожна-транспартнае здарэнне або патрулююць вуліцы. З гэтай задачай выязджаюць і экіпажы спецпадраздзялення дарожна-патрульнай службы «Страла» Міністэрства ўнутраных спраў. Але робяць гэта толькі ў той час, калі яны не занятыя сваімі асноўнымі абавязкамі.**



Галоўная задача «Стралы» — суправаджэнне і эскартаванне найвышэйшых службовых асоб нашай краіны і кіраўнікоў дэлегацый замежных дзяржаў, калі гэта рэгламентавана дыпламатычным пратаколам. Якраз падчас праезду картэжаў мы і бачым яе ў дзейнасці. Задача работы спецпадраздзялення некалі была вынесена і ў яго назву. Назва ж «Страла» з'явілася толькі ў нулявых гадах, адначасова з сімволікай — сіне-белым ромбам са стралой унутры. Атрымаўся цікавы сімбіёз — як вядома, стрэлы ляцяць вельмі хутка, а колеравая гама мае адсылку да Дзяржаўтаінспекцыі.

**«Да дасведчаных супрацоўнікаў ДАІ мы прыглядаемся ўвесь час, асабліва да тых, хто добра зарэкамендаваў сябе ў прафесійных конкурсах. Калі ў «Страле» з'яўляецца вакантнае месца, то кола магчымых прэтэндэнтаў ужо збольшага акрэслена».**

— Перадгісторыя «Стралы» мае свае карані яшчэ за савецкім часам, — згадвае **начальнік спецпадраздзялення падпалкоўнік міліцыі Сяргей ДЗЕМЧАНКА.** — Мінск тады таксама наведвалі высокія госці з іншых краін — як капіталістычнага, так і сацыялістычнага лагера. Прыязджалі сюды і прадстаўнікі высокіх дзяржаўных пасад з Масквы. Адпаведна, была пастаўлена задача належным чынам забяспечыць урачыстую сустрэчу гасцей з рангам і праводзіць іх назад. Дзеля гэтага ў рэспубліканскай Дзяржаўтаінспекцыі быў створаны спецыяльны ўзвод матацыклістаў. У сваю чаргу, ДАІ горада мела ў сваім складзе групу суправаджэння, якая перамяшчалася на аўтамабілях, як бы цяпер сказалі, элітнага класа. Вось так з двух кампанентаў і збіраўся парадны картэж. Гісторыя ж «Стралы» ў яе сучасным выглядзе адлічваецца ад 27 лютага 1993 года. Менавіта ў гэты дзень тагачасны міністр унутраных спраў Уладзімір Ягораў падпісаў загад аб стварэнні адмысловага падраздзялення.

***— Акрамя асноўнай функцыі, у чым яшчэ адметнасць «Стралы»?***

— Мы працуем не па прынцыпе тэрытарыяльнасці, а па ўсёй краіне. Камандзіровак у нашых экіпажаў вельмі шмат. Аказваем практычную дапамогу абласным ДАІ, дзе сітуацыя на дарогах можа быць складаная. Таксама «Страла» можа суправаджаць каштоўныя грузы.

***— Ці ёсць нейкія асаблівыя патрабаванні да супрацоўніка «Стралы»?***

— Перш за ўсё ён павінен мець вышэйшую юрыдычную адукацыю. У сістэме Дзяржаўтаінспекцыі працоўны стаж мусіць складаць не менш за пяць гадоў, каб дасканала ведаць усе асаблівасці службы. Справа ў тым, што на «Стралу» ўскладзена таксама функцыя каардынацыі работы падраздзяленняў ДАІ. І, канешне ж, адпавядаць нашым спецыяльным патрабаванням. Адбор патэнцыйных кандыдатаў вядзецца не толькі па стане здароўя, але і па псіхалагічных якасцях. Менавіта гэты этап і з'яўляецца вырашальным падчас адбору супрацоўнікаў ДАІ, якія пажадалі служыць у нашым падраздзяленні. Напрыклад, на матацыкле можа ездзіць кожны. Але далёка не кожны здольны ехаць увесь час на аднолькава зададзенай хуткасці на адлегласці адзін ад аднаго. А так да дасведчаных супрацоўнікаў ДАІ мы прыглядаемся ўвесь час, асабліва да тых, хто добра зарэкамендаваў сябе ў прафесійных конкурсах. Калі ў «Страле» з'яўляецца вакантнае месца, то кола магчымых прэтэндэнтаў ужо збольшага акрэслена. Канешне, калі да нас прыйдзе афіцэр і скажа, што хоча служыць у «Страле», то пры паспяховым праходжанні адбору ніякіх перашкод для гэтага не будзе.

**«Была пастаўлена задача належным чынам забяспечыць урачыстую сустрэчу гасцей з рангам і праводзіць іх назад. Дзеля гэтага ў рэспубліканскай Дзяржаўтаінспекцыі быў створаны спецыяльны ўзвод матацыклістаў».**

***— Але эфектыўнасць работы залежыць не толькі ад асабовага складу, але яшчэ і ад тэхнікі.***

— Наш аўтапарк абнаўляецца ў планавым рэжыме. Напрыклад, для эскартавання выкарыстоўваюцца матацыклы Yamaha, зробленыя па адмысловым заказе. Іх «фірменнае» адрозненне — белы колер. Таксама ёсць у нас матацыклы BMW. А вось што да аўтатэхнікі службы суправаджэння, то мы выкарыстоўваем як BMW, так і «седаны» Geely SE. Шэсць аўтамабіляў беларускай вытворчасці мы атрымалі мінулай вясной. І дарэчы, зарэкамендавалі яны сябе добра. «Мерседэсы» E-класа мы звычайна выкарыстоўваем для патрульнага рэжыму. А вось аўтамабілі маркі Chrysler ужо пакрысе выходзяць з эксплуатацыі. Хоць і дагэтуль у страі застаюцца машыны, выпушчаныя дзесяць і нават 14 гадоў таму. Справа ў тым, што яны яшчэ не выробілі ўстаноўлены ліміт прабегу. Ён у нас рэгламентаваны вельмі жорстка. Як толькі гэты рубеж перасякаецца, машыну перадаюць у іншую службу.

Увесь наш спецыялізаваны транспарт знаходзіцца, абслугоўваецца і рамантуецца ў аўтамабільнай гаспадарцы Міністэрства ўнутраных спраў. Яна знаходзіцца побач з тым будынкам, дзе размяшчаецца «Страла».

***— А ці зберагаецца тэхніка, напрыклад, у спецыяльным музеі?***

— Пасля рэканструкцыі будынка, у якім мы знаходзімся, з'явіцца спецыяльны музей ДАІ. Будуць у ім і экспанаты, якія маюць дачыненне да «Стралы». Таксама пад шкло вітрыны трапяць загады, асабістыя рэчы супрацоўнікаў. Можна будзе пабачыць і сёетое з тэхнікі. Напрыклад, міліцыянеры захоўваюць матацыкл «Урал». Ён выкарыстоўваўся для эскартавання ў 80-я гады. Увогуле, «Уралы» да нас прыходзілі і ў 90-я. Пасля, калі змяніліся задачы, іх замясціла нямецкая тэхніка.

**«За знешне прыгожай карцінкай, якую шмат хто хоць раз бачыў ужывую, стаяць сотні гадзін напружанай, сканцэнтраванай работы».**

***— Раскажыце, калі ласка, колькі слоў пра трэніроўкі асабовага складу.***

— Яны праводзяцца пастаянна, каб быць увесь час у баявой форме. А вось сутнасць практыкаванняў залежыць ад канкрэтнай службы. Іх у «Страле» ўсяго пяць — аператыўна-дзяжурная, эскартавання, суправаджэння, спецыяльных мерапрыемстваў і інфармацыйна-аналітычнай работы ды матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Напрыклад, служба суправаджэння адточвае свае навыкі на звычайных дарогах. Яны мусяць дзейнічаць правільна ў розных сітуацыях, у тым ліку і надзвычайных. Матацыклісты службы эскартавання выконваюць прыёмы ваджэння як у камандзе, так і паасобку. Напрыклад, на трасе выстаўляюцца спецыяльныя фішкі. Іх кожны матацыкліст мусіць аб'ехаць і не закрануць ніводную, прычым зрабіць гэта на хуткасці. А гэта практыкаванне вельмі няпростае. Спачатку матацыклісты ездзяць па адным, пасля парамі, тройкамі і ў складзе групы. І толькі калі на праезнай частцы ўсе неабходныя навыкі замацаваны, адбудзецца сумесны выезд і трэніроўка матацыклістаў разам з машынамі суправаджэння. Вось так за знешне прыгожай карцінкай, якую шмат хто хоць раз бачыў ужывую, стаяць сотні гадзін напружанай, сканцэнтраванай работы.

Каманда спецыяльнага падраздзялення «Страла» неаднаразова ўдзельнічала ў рэспубліканскіх аглядах-конкурсах прафесійнага майстэрства, якія праводзіліся сярод супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы. Увесь час яна займала і займае прызавыя месцы. А гэта лепш за ўсё сведчыць пра ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў.



**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота аўтара і спецпадраздзялення «Страла».**

Па-за службай

# Творчыя здабыткі сталічнага міліцыянера

**Лічыцца, што адна з умоў атрымання задавальнення ад жыцця — збалансаванасць працоўнай дзейнасці. Гэта значыць, што калі пастаянная работа звязана перш за ўсё з разумовай дзейнасцю, то ў вольны час пажадана мець хобі з разраду «зрабі сам», спартыўнага або творчага кірунку. А калі яшчэ іх удаецца спалучаць разам...**



**«Я заўжды кіруюся прынцыпам, што да чалавека трэба адносіцца справядліва і спагадліва. Толькі тады табе паверацць і не пабаяцца прыйсці і расказаць аб сваёй праблеме. З майго боку, калі нешта паабяцаў, то гэта абавязкова трэба зрабіць. Узяць хоць бы тую ж дапамогу ў працаўладкаванні, якая актуальная для тых, хто выйшаў з месцаў пазбаўлення волі. Так, чалавек аступіўся калісьці, здзейсніў дрэнны ўчынак. Але за гэта ён ужо адказаў. І цяпер стаіць іншая задача — вярнуць яго ў соцыум. А часам даводзілася выцягваць людзей з самага «дна».**

**Інспектар па дазвольнай рабоце Кастрычніцкага РУУС Мінска маёр міліцыі Юрый КУЗЮКОВІЧ** прытрымліваецца менавіта такога пункту гледжання. У яго службовыя абавязкі ўваходзіць кантроль за абарачэннем зброі на тэрыторыі адміністрацыйнай адзінкі. У вольны час ён — майстар на ўсе рукі. Па творчых слядах бацькі пайшоў і сын, які ўдзельнічаў у мастацкіх выстаўках, а цяпер атрымлівае адукацыю дызайнера. Зрэшты, аб усім па парадку.

## ЯК НАСТАЎНІК ПЕРАКВАЛІФІКАВАЎСЯ Ў МІЛІЦЫЯНЕРА

Першая адукацыя ў Юрыя Кузюковіча — зусім не юрыдычная, а педагагічная. Працаваў некаторы час настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе № 95 у Мінску. Маладога настаўніка заўважылі — па кар'ернай лесвіцы ён падняўся на прыступку намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце. І здавалася б, далейшы лёс ужо прадвызначаны, аднак...



Даўняе жаданне стаць міліцыянерам яго не пакідала. У 2014-м годзе ён паступіў у Акадэмію МУС. Акрамя таго, наш герой шчыра сябруе са спортам. Некалі ён займаўся сілавым трохбор'ем, пастаянна практыкаваўся з гірай. Яна, дарэчы, не выходзіць з самастойнага плана заняткаў афіцэра і сёння. Больш за тое, з'яўляецца яго любімым спартыўным снарадам.

— Гіравы спорт даступны для ўсіх, хто не мае абмежаванняў па здароўі. І адначасова не патрабуе якіх-небудзь вялікіх грашовых укладанняў, — расказвае наш герой пра сваё захапленне.

Аднак не спортам адзіным захапляецца Юрый. У яго далёкіх планах — напісаць уласную кнігу, фактуры за час службы сабрана дастаткова. А здольнасць прыгожа выказваць думкі на паперы ў яго ёсць. Напрыклад, да 100-годдзя ГУУС Мінгарвыканкама ён напісаў адмысловы верш з трапнай назвай «На варце». Як прызнаецца сам суразмоўнік, муза можа напаткаць яго дзе заўгодна, нават у самых нечаканых месцах. Можна думаць тыдзень і не напісаць ні радка. А можна напісаць цэлы твор усяго за пару гадзін...

— Я ж колькі часу адпрацаваў звычайным участковым інспектарам, таму ёсць пра што расказаць людзям. Работа ўчастковага шматгранная, вымагае вялікай мабілізацыі сіл і сканцэнтраванасці. А яшчэ — жадання дапамагчы людзям саскочыць з крывой дарожкі.

Юрый Кузюковіч згадвае некалькі гісторый, якія, магчыма, калісьці трапяць на кніжныя старонкі.

— Я заўжды кіруюся прынцыпам, што да чалавека трэба адносіцца справядліва і спагадліва. Толькі тады табе паверацць і не пабаяцца прыйсці і расказаць аб сваёй праблеме. З майго боку, калі нешта паабяцаў, то гэта абавязкова трэба зрабіць. Узяць хоць бы тую ж дапамогу ў працаўладкаванні, якая актуальная для тых, хто выйшаў з месцаў пазбаўлення волі. Так, чалавек аступіўся калісьці, здзейсніў дрэнны ўчынак. Але за гэта ён ужо адказаў. І цяпер стаіць іншая задача — вярнуць яго ў соцыум. А часам даводзілася выцягваць людзей з самага «дна».

Суразмоўнік у думках пераносіцца на дзесяць гадоў таму:

— Запомніўся малады чалавек, якому было недзе пад трыццаць гадоў. Ён актыўна ўжываў курыльныя сумесі. Праз гэта ў яго пачаліся праблемы. Пасля, дзеля большага «эфекту», ён пачаў ужываць заадно і алкаголь. Жыццё пакацілася па нахільнай: сышла жонка з дзіцем, звольнілі з работы, сустрэў дрэнную кампанію. Пасля пераехаў да бацькоў, пастаянна з імі сварыўся... Так мужчына трапіў у поле зроку міліцыі. Я з ім вельмі шчыра пагаварыў. Кажу: ну вось табе 28 гадоў, малады мужчына — і свядома заганяеш сябе ў труну? Адна размова, другая... І вось небарака сам пытаецца: што ж рабіць у такой сітуацыі? Адказ быў навідавоку — калі нельга справіцца самому, трэба лячыцца. Прабыў там ажно год! Калі мы пасля выпадкова сустрэліся, то ён вельмі моцна дзякаваў. Сказаў, што як толькі прыехаў туды, то ўбачыў, як праз ломку ад крыку заходзяцца наркаманы, і зразумеў, што можа стаць такім жа. Да яго вярнулася жонка, паразуменне ў сям'і аднавілася. Нават аўтамабіль купіў...

## «УСЕ ПАДАРУНКІ Я СТВАРАЮ САМ»

У сапраўдную творчую майстэрню ператворана кватэра, дзе жыве сям'я Юрыя Кузюковіча. Шчыруюць на творчым полі яны разам з сынам. Апошні, дарэчы, вырашыў звязаць сваё жыццё з творчасцю — адвучыўся ў гімназіі-каледжы мастацтваў імя І. Ахрэмчыка, цяпер атрымлівае прафесію дызайнера. Як і бацька, займаўся спортам. Вось толькі не сілавым, а каратэ Шатакан. На спаборніцтвах займаў прызавыя месцы, але пасля зрабіў круты паварот у сваім жыцці і знайшоў сябе ў творчасці.

— Апошнюю сумесную работу мы скончылі зусім нядаўна. Зрабілі за тры дні драўляны барэльеф з падсветкай. Праект абмеркавалі з сынам, ён зрабіў эскіз. Маё меркаванне — мастак мусіць быць таксама і крыху скульптарам, каб адчуваць форму і аб'ём. Ды і жыццё цяпер патрабуе быць разнапланавым. Дарэчы, барэльеф у нас — не першы. Пачыналі мы калісьці з пейзажа Венецыі. Яго рабілі па адмысловым эскізе, знойдзеным на прасторах інтэрнэту. Ну а пасля пачалі ўжо нешта прыдумляць самі.

Юрый Кузюковіч згадвае, што ў дзіцячым садку вельмі любіў маляваць, а вось нешта ляпіць з пластыліну — зусім не. Праўда, інтарэс да жывапісу не ўключае ў сябе партрэты — хутчэй, гэта нейкія кампазіцыі альбо нешта адцягнутае. Цікавасць да лепкі адкрыў выпадкова. Неяк перад Раством дапамагаў сыну ляпіць з гліны зайца. І раптам убачыў, што адчувае форму ў прасторы і можа яе перадаць праз матэрыял...

Цікаўлюся ў суразмоўніка, як жа ён усё паспявае?

— Сакрэт поспеху просты — жалезная дысцыпліна. Трэба быць вельмі патрабавальным да сябе і планаваць свой рабочы дзень і тыдзень. І, вядома ж, мець адпаведны псіхалагічны настрой, спрыяльны для творчасці. Увогуле, я стараюся ўсе падарункі ствараць сваімі рукамі. Не магу прыйсці ў госці з рэччу, якая прадаецца ў краме. Гэта нецікава. Ды і прыемна ведаць, што ў сябра ці знаёмага застанецца на памяць часцінка тваёй творчасці...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота з архіва Юрыя КУЗЮКОВІЧА.**

# Прапановы МУС улічаны

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу ўхваліў прапанаваныя праекты законаў Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў» і «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці». Іх прадставіў намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ, паведамляе прэс-служба МУС.**

Ён адзначыў, што ў мінулым годзе ў краіне было зарэгістравана звыш дзесяці з паловай тысяч злачынстваў у сферы маралі, незаконнага абарачэння наркотыкаў і тых, якія датычацца экстрэмісцкай дзейнасці. Са студзеня да лістапада бягучага года зарэгістравана больш за 20 тысяч кіберзлачынстваў.

— У гэтай сувязі паняційны апарат пашыраны тэрмінам «камп'ютарная інфармацыя», а таксама былі скарэктаваны вызначэнні і ўмовы правядзення канкрэтных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, — адзначылі ў прэс-службе ведамства. Увогуле, змены скіраваны на тое, каб павысіць эфектыўнасць аператыўна-вышуковай дзейнасці ў мэтах барацьбы са злачыннасцю. Яны таксама ставяць за мэту няўхільнае выкананне законнасці падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў.

Акрамя таго, быў скарэктаваны пералік падстаў пастаноўкі правапарушэнняў на ўлік. Тут былі ўлічаны палажэнні праектаў новых кодэксаў аб адміністрацыйнай адказнасці. У прыватнасці, у адзіны банк даных прапануецца змяшчаць звесткі аб вызваленні асоб ад адміністрацыйнай адказнасці з вынясеннем ім папярэджання.

— Важнейшае месца ў праекце займаюць нормы, якія вызначаюць парадак паведамлення звестак аб правапарушэннях. Паколькі перадача персанальных даных і звестак аб прыватным жыцці фізічных асоб з'яўляецца абмежаваннем правоў і свабод грамадзян, права на атрыманне інфармацыі аб правапарушэннях з адзінага банка даных без згоды фізічных або юрыдычных асоб даецца толькі шэрагу органаў, асноўнымі функцыямі якіх з'яўляюцца абарона правоў і свабод грамадзян, забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, абароны, грамадскага парадку, — падкрэслілі ў прэс-службе МУС.

Да таго ж, звесткі аб правапарушэннях грамадзяне цяпер змогуць атрымаць і ў электронным выглядзе. Гэта зроблена дзеля дэбюракратызацыі і павышэння даступнасці інфармацыі.

Калонка добрых спраў

# Выратаваць чалавека на пажары

Уначы 16 снежня інспектар дарожна-патрульнай службы АДАІ Клімавіцкага РАУС лейтэнант міліцыі Вадзім Сяднёў вяртаўся дадому са службы. Праязджаючы праз адну з клімавіцкіх вуліц, ён прыкмеціў, што наперадзе ўзнімаецца дым. Пад'ехаўшы бліжэй, міліцыянер убачыў, што «дыміць» нежылы з выгляду дом. Вадзім Сяднёў зазірнуў праз акно, каб убачыць, што там адбываецца. Унутры таксама было ўсё закурана.

Лейтэнант міліцыі тут жа выклікаў ратавальнікаў. Пакуль яны ехалі да месца падзей, афіцэр абышоў дом па перыметры і пастукаў у вокны — унутры маглі быць людзі. Так і аказалася. Каля ўваходных дзвярэй ён пачуў стогны, якія даносіліся знутры. У памяшканні ляжаў на падлозе мужчына і не мог рухацца. Міліцыянер выцягнуў яго на свежае паветра. Дапамога прыйшла своечасова — небарака сур'ёзна не пацярпеў.

Папярэдняя прычына пажару трывіяльная — у кучу смецця трапіў непатушаны недакурак цыгарэты...

# Давезці да запраўкі

Паломка паліўнага датчыка ў аўтамабілі — вельмі непрыемная рэч. Асабліва калі гэта адбываецца за горадам. Кіроўца можа нават і не ведаць, што гаручага ў яго засталося літаральна на некалькі хвілін язды. А калі бензабак пусцее цалкам, то да найбліжэйшай запраўкі можа быць і не адзін кіламетр...

Экіпаж аддзялення ДАІ Баранавіцкага РУУС рухаўся падчас патрулявання па аўтатрасе «Брэст-Мінск». Праязджаючы 220-ы кіламетр дарогі, яны заўважылі аўтамабіль з уключанай «аварыйкай». Міліцыянеры спыніліся і спыталі, ці не патрэбна кіроўцу і пасажыру дапамога.

Аказалася, што такая неабходнасць ёсць. Мужчыны вярталіся са службовай камандзіроўкі, і ў аўтамабілі раптам скончылася паліва. Адпаведны датчык, які мог бы прасігналізаваць пра тое, што трэба заправіцца, аказаўся няспраўны.

Інспектары ДАІ падвезлі мужчыну на найбліжэйшую аўтазаправачную станцыю, дзе ён набыў паліва, а пасля паехалі разам з ім назад да аўтамабіля. Машыну хуценька заправілі, і людзі паехалі дадому.

Аналагічны выпадак адбыўся ў Дрыбінскім раёне. У гэтым выпадку інспектар ДПС ДАІ Дрыбінскага РАУС Мікіта Ісачкоў прыняў рашэнне адбуксаваць аўтамабіль да найбліжэйшай аўтазапраўкі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# «Сёння ёсць запатрабаванасць, каб на ўсіх нашых тэрыторыях больш развіваўся ўдзел грамадства ў абмеркаванні важных рашэнняў»

**З намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, дэпутатам ад Барысаўскай сельскай выбарчай акругі № 63 Ліліяй АНАНІЧ пагаварылі пра эфект дыялогавых пляцовак у вырашэнні праблем грамадства, ролю Усебеларускага народнага сходу ў развіцці краіны, магчымыя змяненні ў медыя-заканадаўстве. Лілія Станіславаўна падзялілася сваімі думкамі аб перспектывах пенсійнай сістэмы, скарачэнні дэкрэтных адпачынкаў і расказала, чаму ў жыхароў сельскай мясцовасці няма значнага запыту на змяненні ў Канстытуцыю.**



***— Нядаўна на адным з мерапрыемстваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў зрабіць Усебеларускі народны сход канстытуцыйным органам, які будзе дзейнічаць на пастаяннай аснове і кантраляваць некаторыя галіны ўлады. Як дэпутацкая супольнасць ставіцца да такой ідэі?***

— Лічу, што гэта прапанова заслугоўвае самай вялікай ўвагі. Яе рэалізацыя будзе далейшым крокам па ўмацаванні нашай беларускай дзяржавы. Усебеларускі народны сход мае вялікую гісторыю. Зараз рыхтуецца шосты такі форум. Фактычна гэта народнае веча. На ім зафіксоўваюцца дасягненні развіцця краіны, разглядаюцца перспектыўныя кірункі, і, самае галоўнае, уносяцца і абмяркоўваюцца прапановы прадстаўнікоў грамадскасці, прафесійных калектываў, тых, хто найбольш поўна прадстаўляе ўсе сферы жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства.

Напярэдадні форуму мы працуем і ў фармаце дыялогавых пляцовак. На іх абмяркоўваюцца разнастайныя найбольш адчувальныя пытанні развіцця рэгіёнаў і краіны, у тым ліку тыя, што могуць быць пакладзены ў аснову для разгляду змяненняў у Канстытуцыю. Вельмі важна, што гэтыя меркаванні (фактычна ўсяго грамадства) будуць сістэматызавацца, класціся ў аснову Усебеларускага народнага сходу. У прыватнасці, я ў сваёй выбарчай акрузе ініцыявала і пры падтрымцы старшыні Барысаўскага раённага савета дэпутатаў Пятра Навіцкага правяла пасяджэнні чатырох дыялогавых пляцовак у самай што ні на ёсць глыбінцы, у аграгарадках і вёсках, практычна з ахопам усіх сельвыканкамаў. Удзельнічалі актыўныя вяскоўцы, прадстаўнікі грамадскасці, кіраўнікі і спецыялісты розных галін. Цікавае абмеркаванне адбылося на дыялогавай пляцоўцы ў Барысаве з удзелам старшыні райвыканкама Генадзя Дзенгалёва. Агульнае ўражанне вельмі станоўчае. У нас неабыякавыя грамадзяне — унесены дзясяткі прапаноў, скіраваных на развіцце грамадскіх інстытутаў, мясцовага самакіравання, паляпшэнне жыцця. Але найбольш людзей хвалююць канкрэтныя пытанні. Лейтматыў выказаных прапаноў — у тым, каб развіваць нашу краіну, грунтуючыся на дасягнутым і ні ў якім выпадку не дапусціць вяртання да яшчэ памятных 90-х гадоў.

***— Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка прадставіў дэпутатам праграму дзейнасці ўрада на будучую пяцігодку. Як вы можаце яе ахарактарызаваць?***

— Так, апошнія тыдні работа парламентарыяў была скіравана на разгляд найважнейшых дакументаў, што будуць вызначаць развіцце краіны ў наступнай пяцігодцы. Гэта і Праграма дзейнасці ўрада на 2021— 2025 гады, і законапраекты «Аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на 2021 г.», «Аб змяненні Падатковага кодэкса», «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва». Усе гэтыя дакументы скіраваны на стварэнне ўмоў для ўстойлівага развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы, забеспячэнне сацыяльных гарантый дзяржавы перад насельніцтвам.

Разгляду законапраектаў і Праграмы дзейнасці ўрада ў Авальнай зале папярэднічала вялікая работа на экспертным дэпутацкім узроўні, на пасяджэннях Пастаянных камісій з улікам актуальных праблем рэгіёнаў, запытаў грамадзян. Хачу адзначыць, што праграма і названыя заканадаўчыя акты цвёрда акрэсліваюць далейшае развіццё краіны як сацыяльна арыентавай дзяржавы.

Галоўная мэта Праграмы дзейнасці ўрада на пяцігодку, і на гэтым асабліва акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр краіны,— забяспечэнне росту дабрабыту і дасягненне высокіх стандартаў жыцця насельніцтва. Найважнейшы кірунак — устойлівае развіццё эканомікі. Безумоўна, глабальныя выклікі, пандэмія значна ўскладняюць умовы (розныя формы кансалідаванай падтрымкі эканомікі і сферы аховы здароўя ва ўмовах пандэміі запатрабавалі на гэтыя мэты ў бягучым годзе каля двух мільярдаў рублёў), але ж выверанасць курсу, канкрэтныя мэты і гатоўнасць адэкватна рэагаваць на выклікі часу заўсёды былі вызначальныя ў дасягненні мэт. У Праграме цэлы шэраг мер па стымуляванні інвестыцый, паляпшэнні інвестыцыйнага клімату, прадпрымальніцкага асяроддзя, развіцця канкурэнцыі. Анансаваны пераход да новай эканомікі, аснову якой будуць складаць прадукты і паслугі. Маштабныя праекты плануецца рэалізаваць у сферы электратранспарту, інавацыйнай аховы здароўя, развіцця «разумных» гарадоў. Важныя кірункі — паляпшэнне кіравання дзяржаўнымі актывамі, дэкрыміналізацыя гаспадарчага заканадаўства, матывацыя кіруючага персаналу, стварэнне буйных дзяржаўных карпарацый, укараненне лічбавых тэхналогій у адміністрацыйную дзейнасць. Задачы вельмі вызначальныя, і таму сёння не будзе перабольшаннем сказаць, што і ад работы кожнага з нас, ад кансалідацыі грамадства будзе залежаць агульны поспех.

У заканадаўчым аспекце будзе працягнута сістэмная работа над эканамічным і сацыяльным блокамі законаў. Урадам анансавана амаль чвэрць новых заканадаўчых актаў і сем кодэксаў.

Абагульняючы, упэўнена, на Усебеларускім народным сходзе якраз і адбудзецца сумеснае абмеркаванне ўсіх вызначальных для краіны праграм і прапаноў.

***— Вы ўжо закранулі пытанне эфекту дыялогавых пляцовак. Наколькі яны дапамагаюць дэпутатам пачуць меркаванні грамадства? Што людзі прапануюць і хочуць убачыць у новай рэдакцыі Асноўнага закона краіны?***

— Дыялогавыя пляцоўкі значна актывізавалі грамадзянскую актыўнасць. Атрымліваецца своеасаблівы зрэз меркаванняў і настрояў. Там гучаць канкрэтныя прапановы не толькі па канстытуцыйным будаўніцтве, але і па вырашэнні пэўных праблем рэгіёнаў і краіны, у тым ліку і па ўдасканаленні заканадаўства.

Разам з тым, што датычыцца Канстытуцыі. Я не адчула ў ходзе абмеркаванняў запыту грамадства на кардынальныя змены Асноўнага закона. Па маёй акрузе на шматлікіх сустрэчах прагучалі толькі адзінкавыя прапановы вяртання да Канстытуцыі 1994 года і пераходу ад прэзідэнцкай да парламенцкай рэспублікі.

Людзей хвалююць надзённыя пытанні, і таму больш прапаноў прыходзілася на тэмы мясцовага жыцця. І ў гэтым сэнсе шмат абмяркоўвалі пытанні мясцовага самакіравання. Сёння ёсць запатрабаванасць, каб на ўсіх нашых тэрыторыях больш развіваўся ўдзел грамадства ў абмеркаванні важных рашэнняў. Мясцовыя Саветы, на мой погляд, павінны мець больш значны статус. Хоць выказваліся і іншыя меркаванні, маўляў, мясцовыя Саветы трэба скасаваць, пераходзіць на выбары старастаў. Але большасць выказвалася за захаванне гэтага інстытута народаўладдзя, наданне яму большых паўнамоцтваў, каб запыты людзей маглі акумулявацца на гэтым узроўні. Калі я працую са сваімі выбаршчыкамі, бачу — цэлы шэраг пытанняў можна вырашаць на месцы, але з-за слабага інструментарыя не заўсёды так адбываецца.

Абмеркаванні былі і па тэме далейшага ўдасканалення выбарчага заканадаўства. Гучалі прапановы і аб укараненні партыйнай выбарчай сістэмы, адзначу, зноў жа, нешматлікія прапановы. Сёння ўвогуле нельга сказаць аб істотным уплыве партыйных структур на жыцце рэгіёнаў. Выразна вызначаюцца буйныя грамадскія арганізацыі. Іх і чуваць, і відаць. На маю думку, калі і разглядаць гэту тэму, то абачліва, з улікам рэальнай сітуацыі. Магчыма, пачынаць паступова, калі б чвэрць парламента выбіралася па партыйных спісах, а астатнія ішлі б па мажарытарных акругах. Вельмі важна было пачуць, што ёсць запыт на замацаванне сямейных каштоўнасцяў у заканадаўстве, павышэнне адказнасці бацькоў за выхаванне дзяцей, абарону інстытута сям'і, акрэсліванне грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі. Непакоіць людзей у сельскай мясцовасці надзённае — працаўладкаванне, даступнасць і якасць медабслугоўвання, дастатковасць месцаў у дзіцячых садках.

***— Вы, акрамя работы ў парламенце, займаецеся і грамадскай дзейнасцю як намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын. Таму, упэўнена, уцягнуты ў абмеркаванне магчымых змен у сістэму водпускаў па доглядзе дзіцяці. Нагадаю, што ў Авальнай зале прэм'ер-міністр агучыў думку паменшыць працягласць аплатнага адпачынку з трох гадоў да двух.***

— Па-першае, гэта была не агучаная кіраўніком урада прапанова, а адказ дэпутату, які выказаў пазіцыю адносна несвоечасовасці такіх рашэнняў. На самай справе, тэма існуе ў публічнай прасторы, аб ёй выказваўся і Прэзідэнт, і якраз у кантэксце, каб яна абмяркоўвалася і дэпутатамі. Яна зыходзіць ад профільнага органа дзяржаўнага кіравання. Таму нядаўна брала ўдзел у змястоўным абмеркаванні гэтай сацыяльна адчувальнай праблемы з супрацоўнікамі дзіцячых садкоў на Барысаўшчыне, шматдзетнымі мамамі, маладымі сем'ямі, якія жывуць у сельскай мясцовасці. Прагучалі надзіва супрацьлеглыя пазіцыі: ад думкі «нельга нічога чапаць» да меркавання, што «трэба, і гэта будзе на карысць дзіцяці».

Тэма найважнейшая, таму і дэпутаты бяруць удзел у яе абмеркаванні, каб не дапусціць неабачлівых працэсаў развіцця. Пэўнае рашэнне пацягне за сабой абвастрэнне праблем. Па-першае, цяпер бачым недахоп месцаў у садках, і гэта актуальна не толькі для гарадоў. Там бацькі маюць магчымасць адвесці дзяцей у дашкольную ўстанову калі не побач з домам, то далей, а на сельскіх тэрыторыях такога варыянта няма. Садкі там змешанага тыпу і знаходзяцца ў памяшканнях, што разлічаны на пэўную колькасць дзетак. Актуальным стане і перагляд колькасці персаналу ў дзіцячых садках.

На карысць двухгадовага тэрміну адпачынку такі факт: многія мамы выходзяць на работу, не чакаючы, пакуль малому споўніцца тры гады. А некаторыя водзяць малых у садкі некалькі разоў у месяц, каб толькі пакінуць за сабой месца ва ўстанове. Да таго ж многія дзеці ў тры гады прыходзяць у садкі непадрыхтаваныя. Таму існуе меркаванне, што два гады — больш спрыяльны ўзрост, каб дзеці ўваходзілі ў выхаваўчы працэс.

Сацыяльная арыентацыя — найважнейшы складнік беларускай дзяржавы. Таму дэпутаты цяпер вывучаюць грамадскую думку, каб усе аргументы былі на нашых рабочых сталах. У студзені мяркуем правесці круглы стол у парламенце на адпаведную тэму з прадстаўнікамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя, Беларускага саюза жанчын. Калісьці працэс абмеркавання скончыцца, і нам прыйдзецца прымаць рашэнне. І калі будзем уносіць змяненні, яны павінны быць на карысць дзяцей, сям'і. Але пакуль, і гэта падкрэсліваю асабліва, ніякіх пэўных дакументаў па тэме дэкрэтнага водпуску няма.

***— Тэма, якую закранулі на пасяджэнні з удзелам прэм'ера, — рэфармаванне пенсійнай сістэмы ў будучай пяцігодцы. Прапанова таксама выклікала шмат пытанняў. Што гэта будуць за новаўвядзенні і навошта яны грамадству?***

— Думаю, што заўчасна абмяркоўваць канкрэтыку. У згаданым мною законапраекце «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2021 год», прынятым парламентам 18 снежня, выразна замацавана, што дзяржава забяспечыць усё неабходнае, каб падтрымліваць узровень пенсіі ў памеры да 40 працэнтаў ад сярэдняй заработнай платы па краіне. Прадугледжаны неабходны фінансавыя сродкі і механізмы іх папаўнення. Пенсійная сістэма — складнік матэрыяльнага становішча грамадства, становішча людзей, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. Таму калі глядзець на перспектыву, а менавіта ва ўрадавай праграме і адлюстраваны кірункі, каб гарантаваць стабільнасць пенсійнага забеспячэння, і будуць разглядацца надалей падыходы па ўдасканаленні пенсійнай сістэмы. Ёсць жа і сусветны вопыт, калі пенсійныя сістэмы складаюцца і з прыватных пенсійных зберажэнняў, і з карпаратыўных пенсійных праграм.

Таму, безумоўна, важна, каб пенсіі павышаліся і каб была большая дыферэнцыяцыя ўкладу грамадзяніна ў выплату.

***— Не магу не запытаць пра круглы стол, прысвечаны заканадаўчаму рэгуляванню СМІ, які праводзілі нядаўна ў Пастаяннай камісі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. Даўно не было мерапрыемстваў на гэтую тэму. Да якіх рашэнняў прыйшлі, ці варта чакаць хуткіх змяненняў права ў галіне?***

— Хуткае не тоесна якаснаму. Слушна было пачуць думкі адносна рэгулявання медыйнай сферы ад Міністэрства інфармацыі, а таксама прафесійны погляд на аспекты, якія павінны знайсці ўвасабленне ў заканадаўстве. На пасяджэннях нашай камісіі зараз абагульняем прапановы. Адзначу, што з улікам тэхналагічнасці сучаснай медыяпрасторы вялікія аб'ёмы інфармацыі распаўсюджваюцца не толькі праз традыцыйныя медыя, пытанні ўдасканалення заканадаўства аб СМІ палягаюць і ў сферы інфармацыі і інфарматызацыі. Таму комплексна разглядаем праблему. Самае галоўнае, што прагучала, — заканадаўства не павінна адставаць ад той сітуацыі, што наспявае ў інфармацыйнай прасторы. На маю думку і на думку іншых удзельнікаў круглага стала, ёсць цэлы шэраг відавочных пытанняў, якія павінны знайсці больш дэталёвае адлюстраванне ў заканадаўстве. Найперш, пытанні дзейнасці так званых новых медыя, сацыяльных сетак, адказнасці за «фэйкі», процідзеяння кібербулінгу, акрэсліванне статусу СМІ-замежных агентаў, празрыстасці замежных грашовых патокаў у інфармацыйнай сферы і шэраг іншых. Відавочна, што ўсе яны палягаюць у прасторы інфармацыйнага суверэнітэту і бяспекі краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# КАВАРНЫ АСТЭАХАНДРОЗ

## Як пазбегнуць праблем з пазваночнікам

**Працяглая сядзячая работа, работа на дачы ці ў гаражы ў выхадныя, няправільны пад'ём цяжару — і гэтага дастаткова, каб адчуць боль у спіне. З узростам ад яго пакутуе ледзь не кожны, а да ўрача часта звяртаюцца тады, калі ўжо занадта позна. Як нашы звычкі і спосаб жыцця знішчаюць пазваночнік, чаму не трэба шкадаваць грошы на добры артапедычны матрац і падушкі, і што рабіць, калі астэахандроз вы ўжо «нажылі», расказаў нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гурбаніджад Гумен ГУШАНГ.**



***— Гумен, ёсць меркаванне, што не існуе такога дыягназу, як астэахандроз...***

— Пачну з таго, што наша планета — не самае лепшае месца для пражывання чалавека. Акрамя розных хвароб, гэта не самыя камфортныя ўмовы: летам трэба змагацца са спёкай, зімой — з холадам. Жывёлы, у адрозненне ад нас, больш адаптаваныя да перападаў тэмператур і хвароб. Ні адна жывёла на нашай планеце не ламае канечнасці, падаючы з вышыні свайго росту, чалавек жа, паслізнуўшыся, можа атрымаць сур'ёзныя траўмы. Да сілы прыцягнення наш арганізм таксама не вельмі адаптаваны. Дарэчы, вучоныя, якія прытрымліваюцца тэорыі касмічнага паходжання чалавека на планеце, прыводзяць гэта адным з доказаў сваёй тэорыі. Сіла прыцягнення для нашага пазваночніка — гэта лішак. І праблемы з пазваночнікам пачынаюцца ў нас ледзь не з нараджэння, а заканчваюцца толькі са смерцю.

Насамрэч астэахандроз пазваночніка — гэта натуральны працэс яго зношвання. І калі бабулі ці дзядулі ў 70-75 гадоў паставілі дыягназ астэахандроз, гэта варыянт нормы, а не хвароба, бо суставы і пазваночнік з узростам змяняюцца. Але вось калі мы кажам пра астэахандроз у маладым узросце, гэта ўжо праблема. У нас ёсць два ўзросты: той, што ў пашпарце, і біялагічны. І яны не заўсёды супадаюць. Напрыклад, калі дзіця ў першым класе носіць акуляры з тоўстым шклом, біялагічны ўзрост яго зроку нашмат большы, чым фізічны. У 70-гадовага мужчыны, які ідзе на паляванне і без акуляраў цэліцца, біялагічны ўзрост зроку меншы, чым фізічны. Гэтак жа біялагічны ўзрост мае і наш апорна-рухальны апарат. Ёсць нават амерыканская шкала па вызначэнні біялагічнага ўзросту, дзе адзін з элементаў — зношванне суставаў і ступень астэахандрозу.

***— Вы сказалі, што праблема пачынаецца ў дзяцінстве. Як ёй супрацьстаяць?***

— Пры неспрыяльным генетычным фактары з дзяцінства будуць слабыя косці і звязкавы апарат. Натуральна, потым гэты чалавек пастаянна мае праблемы то з суставамі, то з касцямі, то з пазваночнікам: усе каталіся з горкі і падалі, але толькі ён зламаў руку.

У дзяцінстве з гэтым можна змагацца з дапамогай харчавання, багатага на кальцый і вітамін Д. Гэта актуальна для беларусаў, бо мала сонечных дзён і хранічна не хапае вітаміну Д. Але яго можна кампенсаваць харчаваннем. Праўда, трэба памятаць, што ў дзяцінстве нельга злоўжываць гэтым вітамінам. Яго лішак нават больш небяспечны, чым недахоп. Калі вітаміну Д зашмат, можа закрыцца зона росту — падаўжэнне трубчастых касцей — і дзіця перастане расці. Таму ў дзіцячых вітамінных комплексах вельмі старанна падабрана яго доза. Тут патрэбна залатая сярэдзіна: мала — дрэнна, зашмат — яшчэ горш.

Мець добры апорна-рухальны апарат і моцныя косці асабліва важна для дзяўчынак, бо падчас і пасля цяжарнасці пазваночнік адчувае велізарныя нагрузкі. Адначасова дзіця забірае кальцый, і пасля родаў такая жанчына можа мець праблемы. І яны будуць толькі ўскладняцца, калі яна захоча нарадзіць некалькі разоў. Таму, акрамя харчавання, бацькі павінны звяртаць увагу на тое, як развіваецца ў дзіцяці пазваночнік. Калі бачым, што дзіця няправільна сядзіць за сталом ці стаіць, варта рабіць заўвагі. У асобных выпадках можна выкарыстоўваць гарсэты, якія надзяваюць днём, падчас урокаў, а ўвечары здымаюць. І даваць палепшанае харчаванне з вялікай колькасцю кісламалочных прадуктаў. Астэахандроз усё роўна будзе, але наша задача — націсную на тармазы, каб ён развіваўся маленькімі крокамі.

***— Што яшчэ ўплывае на здароўе пазваночніка?***

— Правільны кровазварот. Мы яго не адчуваем, але бачым наступствы, праўда, ужо тады, калі становіцца позна. Буйныя сасуды ў нашым арганізме, якія вядуць да галаўнога мозга, праходзяць уздоўж пазваночніка. Гэта галоўныя артэрыі, і яны павінны быць чымсьці абаронены, пазваночнік выконвае для іх ролю своеасаблівага панцыра. І калі доўгі час наша спіна знаходзіцца ў нязручным становішчы, артэрыя пачынае перациска́цца. Калі мы, седзячы, час ад часу рухаемся на крэсле, мяняем позу, артэрыя калі і пераціскаецца на непрацяглы час, то парушэння кровазвароту як такога няма. Калі ж мы доўгі час знаходзімся ў нязручнай позе, натуральна, наш пазваночнік пазбаўляецца нармальнага кровазвароту. А дрэннае харчаванне, недахоп кіслароду паскараюць яго зношванне.

Мы ўсе спім мінімум 6-8 гадзін. Калі нам нязручна, прачнуўшыся, мы будзем адчуваць дыскамфорт у розных частках цела. Калі матрац і падушка нязручныя, цягам 6-8 гадзін парушаецца кровазварот пазваночніка. Калі гэта адбываецца кожны дзень, мы сутыкнёмся з пэўнымі наступствамі. Таму не трэба шкадаваць сродкаў на тое, каб стварыць сабе камфортнае месца для сну. Гэта павінны быць добрыя артапедычныя матрац і падушка. Прычым не трэба іх выбіраць па прынцыпе «чым даражэй, тым лепш». Гэта як туфлі — прымяраем і адчуваем, камфортна ці не. Жорсткасць артапедычнага матраца выбіраецца ў залежнасці ад вагі цела і стану пазваночніка. Памер пляча ў кожнага чалавека розны, таму падушка выбіраецца з улікам адлегласці ад шыі да краю пляча. Калі падушка занадта высокая, шыйны аддзел пазваночніка будзе скручвацца наверх, калі нізкая — згінацца ўніз. Калі ж вы спіце на канапе, яна павінна быць цвёрдая і не правальвацца. Калі заначавалі дзесьці ў гасцях, лепш пасцяліць некалькі коўдраў на падлозе і спаць на жорсткім, чым на паламанай канапе, калі раніцай будзе балець і шыя, і спіна, і ногі.

***— Калі раніцай прачынаешся і нічога не баліць, значыць, умовы для сну нармальныя?***

— Звычайна так. Сон адыгрывае важную ролю ў нашым жыцці: калі ён некамфортны, наступны дзень будзе разбіты. Для камфортнага сну павінна быць не толькі зручнае месца, але і пусты страўнік. Калі вы паелі на ноч, арганізм вымушаны працаваць, пераптраўліваючы ежу. Негатыўна на сон уплывае і храпенне. У гэты час мозг пакутуе ад гіпаксіі — недахопу кіслароду. Трэба вырашаць гэту праблему медыцынскімі метадамі або прымаць позу, у якой храп найменшы. Спрыяюць храпенню лішняя вага і ўжыванне ўвечары алкагольных напояў. Храпенне ў далейшым выклікае гіпертанію, гіпаксію мозга і іншыя праблемы. Калі гэтыя ўмовы — камфортнае спальнае месца, пусты страўнік і нармальнае дыханне — выконваюцца, можна гарантаваць, што на наступны дзень вы будзеце бадзёрыя, працаздольныя і ў добрым настроі.

***— Пры сядзячай рабоце праблемы са спіной, здаецца, непазбежныя...***

— Сапраўды, правільна арганізаванае рабочае ці вучэбнае месца важныя для здароўя пазваночніка. Найперш яно павінна быць дастаткова прасторнае, каб была магчымасць выцягнуць ногі і паварушыць імі. У сядзення павінна быць артапедычная спінка, цяпер прадаюцца дадатковыя падкладкі, і яны таксама падбіраюцца індывідуальна. Калі вы вымушаны доўга сядзець, кожныя 15—20 хвілін трэба ўставаць і размінаць цела, рухацца, каб аднавіць кровазварот.

***— Калі скрыўленне пазваночніка ўжо ў наяўнасці, што рабіць?***

— Наш пазваночнік мае ўласны мышачны гарсэт. Гэта мышцы, якія ахопліваюць яго з чатырох бакоў. Развіваць іх важна з дзяцінства. Яны бяруць на сябе пэўную дадатковую нагрузку, якая ідзе на пазваночнік. Чым лепш яны развітыя, тым большую нагрузку бяруць на сябе, калі мы перагружаем свой пазваночнік. Калі «гарсэт» слабы, то падчас работы на дачы, прыборкі ці пад'ёму цяжару наш пазваночнік больш уразлівы.



***— Пажылыя людзі зімой нярэдка вядуць маларухомы спосаб жыцця, а вясной, выязджаючы на агароды, атрымліваюць такую нагрузку, што часам прыходзіцца звяртацца па доктара...***

— Любы ўрач са шматгадовым стажам скажа, што пажылыя людзі ўсю зіму лечаць спіну і суставы, каб псаваць іх летам. Прычым з закрыццём кожнага дачнага сезона абяцаюць, што гэта было апошні раз, а вясной, на жаль, усё пачынаецца зноў. Часам знішчаюць пазваночнік і апорна-рухальны апарат да такой ступені, што самастойна не могуць дайсці да дачы. Тут трэба разумець, што ў 70 гадоў нельга выканаць той жа аб'ём работ і з той жа хуткасцю, якія вы рабілі ў 40. Калі па ранейшай звычцы хочацца ўсё зрабіць, то не трэба быць доктарам, каб прадказаць вынік.

Важна мець умераную нагрузку круглы год. Наш арганізм як ровар: пакуль рухаецца, ён трымаецца, калі спыняецца — падае. Фізічная нагрузка для арганізма — неабходнасць. Гэта не толькі падтрымлівае мышачны тонус, але і разганяе кроў, трэніруе сэрца і лёгкія, праз пот выходзяць шкодныя рэчывы.

Важна і тое, як мы носім цяжар: калі ідзём у магазін па прадукты, пажадана выкарыстоўваць каляску, а не карзіну. Калі набываем шмат прадуктаў і ідзём дадому пешшу, то варта несці дзве сумкі ў дзвюх руках. Лепш увогуле некалькі разоў схадзіць і ўзяць патроху, чым несці ўсё за адзін раз.

***— Ці варта прымаць хондрапратэктары, каб палепшыць стан пазваночніка?***

— Кожны пазванок мае свой храсток, і ён павінен быць эластычны. Чым большая пластычнасць, тым лепш працуе пазваночнік, тым больш гнуткая спіна. Тут важнае дастатковае ўжыванне вады, каб арганізм, а разам з ім і храсткі не перасыхалі, — 1,5-2 літры. Таксама трэба ўжываць прадукты, якія ўтрымліваюць жэлацін. Ён уваходзіць у структуру храстка і робіць яго больш эластычным. У сярэднім і старэйшым узросце варта перыядычна прымаць хондрапратэктары. Гэта вялікая група прэпаратаў, кожная фармацэўтычная фірма ўхваляе свой. Тут варта прыслухацца да парады вопытнага ўрача і іншых людзей, якія прымалі іх.

***— У якім выпадку неабходна ісці да ўрача?***

— Калі мы адчуваем, што боль з пазваночніка «аддае» ў ніжнія ці верхнія канечнасці — «страляе» ў руку ці нагу, — гэта сведчыць, што мы запусцілі астэахандроз і з'явіліся ўскладненні — пратрузіі, грыжы. І ў гэтым вінаватыя мы самі, бо прапусцілі момант, калі ў пачатку хваробы павінны былі звярнуцца да спецыяліста і разабрацца, чаму баліць пазваночнік. Замест гэтага мы перацярпелі, далі дадатковую нагрузку, сядзелі на рабоце не так, як трэба, перастараліся на дачы — і атрымалі пэўныя ўскладненні. Чаму «страляе» ў руку ці нагу? Паміж пазванкамі праходзяць нервовыя карэньчыкі. Калі адлегласць паміж пазванкамі змяншаецца, сохне храсток ці выступіла міжпазваночная грыжа, міжпазваночны нерв пачынае пераціскацца. І куды вядзе нерв, туды і адчуваецца «стрэл»: калі гэта верхні аддзел пазваночніка, то ў рукі, калі ніжні, то «страляе» ў ногі. На гэтай стадыі абавязкова трэба звярнуцца да спецыяліста, які прызначыць больш сур'ёзнае лячэнне. У некаторых выпадках даходзіць да аперацыі, бо медыкаментознага лячэння ці фізіятэрапіі ўжо недастаткова. Трэба разбіраць пазваночнік, вызваляць нерв, прыбіраць грыжу. Але гэта вялікая аперацыя і вялікі стрэс для арганізма. Трэба рабіць усё, каб да такога не дайшло.

Многім добра дапамагае турнік. Дастаткова проста павісець на руках, цалкам расслабіўшы ўсе мышцы. Працуе сіла прыцягнення, і калі гэта не надта запушчаны выпадак, пазванкі з часам расцягваюцца, становяцца на свае месцы, вызваляючы нервовыя карэньчыкі. Але тут важны момант прызямлення. Вышыня турніка павінна быць такой, каб пры спуску не трэба было скакаць. Бо ўсё, што мы расцягнулі, зноў сціскаецца. Лепш апускацца на дыбачкі. Я сам пастаянна рабілю гэтае практыкаванне на турніку. Вісець трэба столькі, колькі атрымліваецца. Калі чалавек больш сталы, ён можа вісець менш, але часцей. Але гэта трэба рабіць працяглы час.

# ГОД ПАЧЫНАЕЦЦА З НАДЗЕЙ...

**Снежань, праспект, вольная часіна... Можна прайсціся, а калі і пад руку... Ззаду дзіўныя гукі: не тое шоргат, не тое стук? І галоўнае, што нікога там, апроч... маленькага шэрага сабачкі, абутага, як аказалася, у адмысловыя чаравічкі.**

**А што — зручна: выводзячы на вуліцу, усцягнуў, вярнуўшыся дадому — зняў. Лапкі можна не мыць, ваду і свой час не траціць...**

**Лянота — рухавік прагрэсу.**

## НЕ ПРА САБАКУ

Святло ў гэтай хаце загаралася пазней — спачатку, як казалі вяскоўцы, «уключалася радзіва». Гэта значыць, на ўсю вуліцу неслася грознае: «Гультаіна! Пустадомак! Дакуль ты будзеш ляжаць? Столькі работы, столькі работы!..»

Пералік яе шчодра «аздабляўся» папрокамі і крыўднымі параўнаннямі (нехта зрабіў, а ты не), безліч было абраз, а то і мацюкоў: Галя будзіла мужа.

Што цікава, ужо другога. Першага, як казалі вяскоўцы, яна «загрызла» раней.

(У Даля, дарэчы: «Сабака разумнейшы за бабу: на гаспадара не брэша»).

## КАМУ ВІДНЕЙ?

Халадзільнік дома вялікі — здараецца, усё «не ўпасеш». Тварог вось пераляжаў: дастала на вячэру, а там, што называецца, чорным па беламу: «Срок годности до...». І дата... Калі ёй верыць, то прадукт трэба выкінуць.

Адкрыла — нічога такога: тварог як тварог — і на від, і на пах, і на смак (гарчынка — хіба ў галаве — ад надпісу).

...У Балгарыі, між іншым, яны не такія: там на ўпакоўках прадуктаў пазначаецца кароткае: «Най добър до...».

А далей ужо сам глядзі. І сам думай.

## НЕ ЛЁС

Гога, ён жа Гоша... Але не Жора. Ён — Ігар.

Імя як імя. І занятак у яго як занятак: ён мерчандайзер — прадае, дакладней, адсочвае продаж пэўных тавараў. Спачатку — сродкаў для мыцця, потым — кавы ды гарбаты.

Пра іх Гоша ведае ўсё! Ён добра працуе і зарабляе. Што, вядома ж, радуе яго сям'ю...

І што, вядома ж, засмучае ўсіх, хто ведаў, як марыў гэты хлапчук стаць архітэктарам, як тройчы паступаў, як прагна вучыўся, каб ведаць... Усё...

Не пра мыйныя сродкі і каву.

## ПЕРАЛОМ

На работу ў той ранак Ваня паехаў сам, а вось адтуль яго ўжо забралі: на «хуткай», без рукі — так званая вытворчая траўма.

Хапіў з ёю ліха... Але ж, дзякаваць Богу, «ласты не склеіў»: навучыўся (адной левай!) адзявацца-раздзявацца, дровы секчы, потым машыну вадзіць — сваю... А ўжо далей болей — стаў рамантаваць чужыя і, можна сказаць, аджыў... Але тут жонцы яго не пашчасціла — зламала нагу...

Надоечы мы ёй званілі — на мабільны. Спыталі найперш, ці не перашкодзілі, ці можа яна размаўляць?

— Магу, — ахвотна адгукнулася Алачка, — мы тут з мужам у краме... Прадукты на тыдзень бяром, а заадно — людзей весялім.

«Убачылі», як яны, напару (ён з пустым рукавом, яна ў гіпсе і на мыліцах) ходзяць па гандлёвай зале, як перад імі расступаецца народ, з якой цікавасцю пазірае, бо пара ж і сапраўды нечаканая, сапраўды прыгожая...

І хто б гэта ўбачыў, калі б... не пераломы?

## СЛАВА НЕ АБДЫМЕ...

...«Дзед, глянь, гэта я намалявала!» — пахвалілася малая, уручыўшы не старому яшчэ свае карціны.

Той уважліва ўсё разгледзеў — мусіць, каб потым зрабіць выснову: «Ты, унучка, не будзеш мастачкай, не... Бо ты ўжо мастачка!»

Не дзіва, што тое дзіця ёй стала.

Іншае — пакуль што расце... І вучыцца. Днямі, напрыклад, з гадзіну карпела, але ж намалявала тату, маму, кошку Умку і брата, які прынёс ёй мышку... Карацей — усіх самых любімых, сваю сям'ю.

Што цікава, намаляваць яе можа нават дзіця, а вось стварыць ці хаця б захаваць...

Складаная справа, пакуль не зразумееш, што сям'я (спачатку тая, у якой нарадзіўся, потым тая, што стварыў) — гэта самае важнае, што кар'ера, як казаў хтосьці з вялікіх, не будзе чакаць цябе дома, грошы не вытруць слёзы, а слава не абдыме ноччу.

## ЗАБУДЗЬСЯ!

Дом. Кухня. Тэлевізар (звыклы памагаты). Рэклама... Значыць, уключаем іншы канал. І...

Гэта трэба было ўбачыць!

Лета на экране, рэчка. Двое — ён і яна — відаць, закаханыя, плёскаюцца ў вадзе, смяюцца, цалуюцца...

Яшчэ двое — ён і яна — значна старэйшага ўзросту — назіраюць за парай з берага.

— Ты нічога не бачыў. Забудзься, — загадвае жанчына (відавочна, мужу той, што купаецца).

— Але як? — не разумее той. — І чаму?.. Калі я магу зараз падысці, сказаць... І нават даць у морду.

— Ну дасі... І атрымаеш сам... Ён — хутчэй за ўсё — цябе пераможа. І яна застанецца з ім...

— А калі я перамагу?

— ...Яна ўсё роўна застанецца з ім, бо стане шкадаваць... Таму забудзься — ты нічога не бачыў. І будзеш жыць, як жыў.

...Цікава: колькі сямейных саюзаў распалася з-за таго, што ў горкую гадзіну побач (з мужам ці жонкай) не было вось такога дарадцы.

## ШТО ПРАЎДА, ТОЕ ПРАЎДА

У аб'ёмным выданні — аб'ёмны артыкул. Актуальная тэма: спецыялісты пішуць, як да старасці захаваць свае зубы. Добра было б пачытаць, калі б час быў... Калі няма, дастаткова ўспомніць крылатае: «Зубы лепш за ўсё ратуе своечасова закрыты рот».

Так гавораць аўцюкі. І не паспрачаешся.

## «САНТА-БАРБАРА» МЯСЦОВАГА «РАЗЛІВУ»

...Гэтыя аднакласнікі, як і многія, абяцалі з'язджацца ў школу штогод і налета прыехалі, потым — праз пяць гадоў пасля выпуску, праз 20 і нават праз 40 з двух класаў аж пятнаццаць чалавек сабраліся — пераважна «дзяўчат». Але «хлопцы» таксама былі. І нават зрабілі ўсё па-даросламу, па-мужчынску: прывезлі на сустрэчу любімых настаўнікаў, заказалі рэстаран...

Добранька пасядзелі: пагаварылі, патанцавалі, а «дзяўчаткі» нават пасакрэтнічаць паспелі.

Адна з іх расказала, як закахалася («дах падчыстую знесла!»), як кінула дом, дзяцей (!), як паехала на край свету... Як жыла там, што называецца, «на разрыве» паміж сапраўдным і пакінутым, як яно, апошняе, стала ўсё больш перацягваць і як тады першы муж сказаў: «Вяртайся. Слова даю, што ніколі ні ў чым не папракну»...

«Санта-Барбара», карацей.

«Дзеўкі» слухалі яе, стаіўшы дыханне, а адна — самая чуллівая — дык нават слязу пусціла.

— Не трэба мяне шкадаваць, — спыніла яе апавядальніца.

— А я не цябе, не! — шморгнула носам аднакласніца. — Я... сябе шкадую: ані разу ў жыцці мне «дах не зносіла»...

І ўжо не знясе.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Сталіца. Могілкі і магілкі.

Яны, як паўсюль, розныя. На нейкіх — адразу відаць — сваякі бываюць часта, прыбіраюць і даглядаюць, на нейкіх — не бываюць зусім, бо помнікі даўно пахіліліся, а то і разваліліся, агароджы «патанулі» ў быльнягу ды кустоўі...

Адзінае, што на іх відаць было, — гэта прымацаваныя белыя «цыдулкі» з патрабаваннем навесці парадак і папярэджаннем, што ў адваротным выпадку помнікі могуць знесці.

...Дзе-нідзе такое ўжо робіцца: гэта значыць, на месцы старых магіл з'яўляюцца новыя.

І тым самым ад тых, хто ў гэтым горадзе жыў, не застаецца нават імёнаў: Цыля, Ізя, Марфа, Збышак... Іх быццам не было...

Калі не было нашчадкаў.

## ПАРАЛЕЛІ

Некалі з асалодай чытала ўспаміны Алякся Карпюка «Развітанне з ілюзіямі», потым — Уладзіміра Познера, што таксама развітваўся — расказваў пра сябе, пра час і Расію.

Адзін эпізод: у 2005-м з Масквы прыляцеў у Нью-Ёрк і па дарозе згубіў пашпарт.

Назаўтра ён паведаміў пра гэта ў пашпартны цэнтр і далей досыць падрабязна апісвае, да каго там звяртаўся, колькі чакаў, на якім паверсе і ў якім акенцы запаўняў прапанаваны бланк, як здабываў ксеракопію дакумента аб грамадзянстве, потым высветліў, што патрэбен арыгінал, а той у Маскве, куды не вылеціш без пашпарта і ў Вашынгтоне... Яго, мауляў, прышлюць, праўда, за 90 долараў...

Чалавек без пашпарта згадзіўся б заплаціць куды болей! І па пашпарт прыйсці праз тыдзень ці нават праз месяц...

Яму назначылі сустрэчу на 15 гадзін таго самага дня і роўна ў 15 папрасілі распісацца — у атрыманні... новага пашпарта. «Сэр, я не магу падабраць словы, каб выказаць вам сваю ўдзячнасць за такую работу, — сказаў уладальнік. — Я вельмі ўражаны!»

На што чыноўнік — трэба разумець, не бачачы ў тым нічога незвычайнага — вельмі сур'ёзна адказаў: «Сэр, вы плаціце за гэта падаткі»...

Мы — у Беларусі, у Расіі — іх плацім таксама.

Цікава, за колькі дзён тут аднавілі б страчаны пашпарт?

## У ЧЫМ ВЫМЯРАЕЦЦА ШЧАСЦЕ

Горад, кавярня, шматлюддзе і над усім — гучнае пытанне:

— Э-э, хто на ўваходзе свой чорны «Мэрседэс» паставіў?!

Замест адказу і з-за тога ж століка:

— Слухай, чаго ты крычыш? Гэта ж твая машына!

— А можа, хто не ў курсе?!

Гэта — анекдот, магчыма — пра Наташу, бо яна, здаецца, і сапраўды ўжо ўсім расказала, што бацька ёй трэцюю машыну купіў — новенькую, з салона...

— Добра табе...

— Шчаслівая...

— Багатая, — за вочы і ў вочы зайздросцяць сяброўкі...

Бо ў іх плюс-мінус 25 шчасце ды багацце і сапраўды могуць вымярацца «машынамі». А вось потым, у канцы...

Мусіць, колькасцю людзей (пажадана родных і побач!), якіх ты любіш і якія па-сапраўднаму любяць цябе.

## КАБ ВЕДАЛІ...

Горад, майстэрня, надпіс на сцяне:

«Хочаш дапамагчы малому — зрабі разам з ім,

Хочаш дапамагчы старому — зрабі замест яго,

Хочаш дапамагчы майстру — не замінай,

Хочаш дапамагчы дурню — сам такі».

Як быццам новага тут нічога — прапісныя ісціны. Але ж нехта сфармуляваў іх?

І тым самым «узброіў» іншых — на першы погляд элементарным: веданнем, як жыць.

## ЧАКАННЕ РАДАСЦІ

...Гэтае дрэўца расло асобна, можна сказаць, наводшыбе, але ўвагі на яго не звяртаў ніхто. Прынамсі — у пачатку лета. А вось пад восень...

Пад восень нешта зрабілася, і на ім, зусім маладым, неяк раптоўна апала лісце: здалёк стала відаць, што дрэўца — хворае, нават мёртвае (сярод жывых), што яно, вось такое, псуе гарадскі пейзаж.

Праўда, з сякерай ці пілой да яго чамусьці не ішлі, а вось з гірляндай...

Перад Раством даўжэзная, з блакітных электрычных лямпачак, яна «аблытала» доўгія сухія галіны. І дрэўца стала жывое, можа, нават адзіна жывое!..

Сярод безлічы «мёртвых».

**Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж:** напярэдадні святаў тост-пажаданне (па просьбе чытачоў):

*Так павялося між людзей —*
*Год пачынаецца з надзей...*
*Што новы — ён не будзе горшы,*
*Што на патрэбы будуць грошы,*
*Што нас здароўе не пакіне*
*І ўсё ліхое недзе згіне,*
*Што запануе згода ў свеце*
*І на пацеху будуць дзеці...*
*Калі змяніць яго не ў стане,*
*Душу начальства не дастане*
*Ды і другія лайдакі...*
*Што не разлюбяць сваякі.*
*Што будзе хлеб!*
*І ранкам — кава,*
*Што будзе час да нас ласкавы:*
*Не ляжа глыбаю на плечы.*
*І будзе што зварыць у печы.*
*І будзе гурт, каб тое з'есці.*
*І будзе кут усім пасесці.*
*І будуць келіх і віно...*
*Каб прагучала тут назноў:*
*Хай новы год не будзе горшы,*
*Хай на патрэбы будуць грошы...*
*(І... верш спачатку пачынай,*
*Змяніўшы «што...» на заклік «хай!»:*
*З мальбой —*
*Да Бога — ад людзей:*
*Год пачынаецца з надзей...*

# ТРЫ АМПЛУА УЛАДЗІМІРА ЧУЖАЎКІ

## Настаўніка з аграгарадка Вішоў Бялыніцкага раёна ведаюць яшчэ як заўзятага краязнаўцу і Дзеда Мароза

**Кожны праслаўляе сваю малую радзіму як умее, а вось Уладзімір Фёдаравіч прысвяціў сваёй другой малой радзіме... энцыклапедыю. Нарадзіўся ён на Гродзеншчыне, але больш за трыццаць гадоў пражыў у Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобласці. Матэрыял збіраў працяглы час, а вось кампанаваў і апрацоўваў яго менавіта ў апошнія тры гады, якія, як вядома, прайшлі пад знакам малой радзімы. Кніга амаль гатовая, засталося аднесці ў друк. Настаўнік пагадзіўся прыадкрыць некаторыя таямніцы яе напісання і расказаць, чым цікавая сучасная гісторыя аграгарадка.**



### ШКОЛА-МУЗЕЙ

Вішоўскай школе, дзе Уладзімір Чужаўка працуе гісторыкам, у будучай энцыклапедыі адведзена пачэснае месца. Утварылася яна ў выніку зліцця Нежкаўскай сярэдняй школы і Вішоўскай васьмігадовай. І сёлета споўнілася роўна сорак гадоў, як гэта адбылося. Па памерах напэўна, гэта самая вялікая сельская школа — разлічана на 600 вучняў. Да ведама, за апошнія сорак гадоў тут падрыхтаваны 118 медалістаў. Сёння школа запоўненая ўсяго на трэць, але, як адзначыла яе дырэктар Кацярына Зайцава, колькасць кандыдатаў у першакласнікі паступова расце. Першае, што кідаецца ў вочы, вялікая колькасць карцін з краявідамі аграгарадка і яго наваколляў. Яны вісяць у калідоры, школьнай «Гасцёўні», кабінеце дырэктара. Яшчэ больш іх у мясцовым музеі, які знаходзіцца на першым паверсе школы. Адзін уваход, дарэчы, з вуліцы, а другі са школьнага калідора. Ідэя ўвасобіць у фарбах селяніна і гэтым уславіць яго нялёгкую працу належыць вядомаму на ўсю краіну кіраўніку СВК «Калгас «Радзіма» Аляксандру Лапацентаву — Вішоў якраз цэнтральная сядзіба гэтай гаспадаркі. Старшыня гаспадаркі арганізаваў пленэр і запрасіў на яго прафесійных мастакоў. Вопытны кіраўнік такім чынам паклапаціўся пра патрыятычнае выхаванне вішоўскай моладзі. Яны павінны расці менавіта на тутэйшых прыкладах, а не шукаць іх дзесьці ў іншым месцы. Таму музей прадбачлівая і размясціці ў школе. Па-першае, выкарыстоўваецца не задзейнічаная дагэтуль школьная плошча, па-другое, лепшага месца для ўрокаў гісторыі роднага краю не знайсці. Акрамя карцін, ёсць шмат іншых экспанатаў, якія ілюструюць сялянскае жыццё, калектывізацыю, ваеннае ліхалецце, трагічныя афганскія падзеі, гісторыю стварэння калгаса «Радзіма» і яго дасягненні. «Наш музей насамрэч вельмі змястоўны, — адзначае Уладзімір Чужаўка. — Не сорамна і высокім гасцям паказаць. І Прэзідэнт у нас быў, і міністры адукацыі, і сельскай гаспадаркі таксама».

— Аляксандр Лапацентаў апякуе школу як можа, — заўважае гісторык. — Дзякуючы яму ўмацоўваецца наша матэрыяльна-тэхнічная база, а школьнікі за добрую вучобу ў канцы чвэрці атрымліваюць стыпендыю. Так старшыня калгаса заахвочвае будучыя кадры.



Уладзімір Чужаўка з гонарам расказвае, што іх дзеці падчас летняй практыкі нават зарабляюць грошы. Пры школе функцыянуе сельскагаспадарчая брыгада «Задоранка», якую курыруе «Калгас «Радзіма». Падлеткі з малодшых, як той казаў, пазногцяў прывучаюцца да работы на зямлі, займаюцца праполкай, даглядаюць сад. Акрамя зарплаты, яны забяспечваюцца гарачым харчаваннем і атрымліваюць права з'ездзіць за кошт гаспадаркі на двухдзённую экскурсію ў любы куток Беларусі. Шмат хто ўжо пабываў у Гродне, Брэсце, Лідзе, Полацку, Мінску, іншых мясцінах.

— Гэта таксама прывівае любоў да сваёй краіны і цікавасць да таго куточка, дзе жывеш, — удакладняе настаўнік. — Калі пачынаецца вучэбны год, мы замацоўваем матэрыял у даследчых работах па краязнаўстве. У тым ліку і пра нашу школу, сабрана шмат інфармацыі, пра настаўнікаў, знакамітых вучняў.

### ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНЫЯ ГЕРОІ

Самога Уладзіміра Фёдаравіча на краязнаўчую «хвалю» натхніў яшчэ адзін аматар даўніны — рэдактар Бялыніцкай газеты «Зара над Друццю» Міхась Карпечанка.

— Пазнаёміліся з ім падчас ваенных збораў у Бабруйску ў хуткім часе пасля таго, як мы з жонкай прыехалі жыць у раён — у канцы 80-х мінулага стагоддзя, — згадвае Уладзімір Чужаўка. — З таго моманту я пастаянна нешта шукаў, запісваў. Сын неяк спытаўся, ці ведаю я столькі ж пра тыя мясціны, дзе нарадзіўся. І я шчыра прызнаўся, што не. Нешта ў памяці засталося са школьных часоў, але толькі агульнае.

Сваю краязнаўчую дзейнасць суразмоўнік пачынаў з даследавання трагічнай старонкі Бялыніччыны — вёскі Малінаўка, якую карнікі спалілі разам з жыхарамі. На памятным камяні, дзе выбітыя прозвішчы тых, каго знішчылі, яго зачапілі надпісы: Бялоў — хлопчык, Бялова — дзяўчынка. А дзе ж іх імёны? З гэтага пытання і пачаліся пошукі.

— Знайшоў некалькіх відавочцаў, якія цудам выратаваліся з гэтага пекла, — кажа настаўнік. — Дзякуючы ім я атрымаў новыя факты той карнай аперацыі, якая адбылася 16 лютага 1943 года. Тых жа Бяловых у вёсцы жыло пяць братоў. І ў кожнай сям'і было па пяць-шэсць дзяцей. З болей чым ста чалавек з гэтай і іншых вёсак у Малінаўцы спалілі 56 дзяцей.

Шмат чаго расказалі ветэраны вайны. Васіль Алістраў, напрыклад, ваяваў у партызанскім атрадзе Асмана Касаева. А дапамог яму туды трапіць... нямецкі афіцэр.

— На той момант, калі пачалася вайна, Васіль вучыўся ў Магілёве ў вучылішчы, — удакладняе Уладзімір Фёдаравіч. — Пра вайну даведаўся, калі з сябрамі ішоў з вёскі ў Магілёў. Ім даручылі гнаць жывёл у бок Масквы, каб немцам не дасталіся. У Смаленску яны перадалі тых кароў і на конях паскакалі дамоў. Бялыніччына ўжо была акупаваная ворагамі. Калі хлопцы падышлі да калодзежа, каб напіцца вады, іх затрымаў нямецкі салдат. На шум з хаты выйшаў афіцэр варожай арміі. Ён загадаў салдату пакінуць яго з хлопцамі адных. Калі той адышоў, немец на ломаней рускай мове патлумачыў ім, што ён «тэльманец» і нічога дрэннага ім не зробіць. Наадварот, паклапаціўся накарміць іх і падказаць, як прайсці ў атрад.

Вайна пакінула на сэрцы старых людзей глыбокія шрамы, але былі на фронце і кур'ёзныя выпадкі. Ветэран вайны Аляксандр Тарасавіч Аўтушэнка цудам застаўся жывы, перажыўшы шмат атак пад свінцовым дажджом. Ва Усходняй Прусіі, дзе ён ваяваў, смерць пагражала з усіх бакоў. Прадукты і снарады завозіліся са спазненнем, увесь час хацелася есці. Аднойчы, калі мінамётны агонь сціх, байцы ўбачылі на пазіцыі перад сабой... курыцу. Самы спрытны схапіў яе, і ўсе кінуліся дапамагаць яму яе абшчыпваць. Але зноў забухалі снарады, і прыйшлося кінуць здабычу. Ашалелая ад страху птушка мітусілася па полі пад кулямі, а чырвонаармейцы, стаміўшыся ад пастаяннага напружання, смяяліся ўголас. Яны бачылі не жывую істоту, а абед, які так бяздарна ўпусцілі. Але больш было ўсё ж такі слёз. Аляксандру Аўтушэнку пашчасціла выжыць, ён дайшоў да Берліна і нават пакінуў на сценах рэйхстага сваё прозвішча. Але там жа, у Берліне, на адной з вуліц ён убачыў, як нясуць яго забітага брата. Апошні раз ён бачыўся з ім, калі ішоў на фронт. І тут такая жахлівая сустрэча. Аляксандр Тарасавіч зрабіў усё для таго, каб цела роднага чалавека адвезці дадому і пахаваць яго на роднай зямлі.

### ЦІ МЕЎ АДНОСІНЫ ДА ВІШОВА ВІТАЎТ?

Без мінулага няма будучага, нагадаў сабе аднойчы Уладзімір Чужаўка і ўзяўся сістэматызаваць напрацоўкі. Прызнаецца, што на стварэнне энцыклапедыі яго натхніў вучань Мікалай Бацішча, з якім яны рыхтавалі даследчую работу па родным краі. Былы школьнік, дарэчы, зараз курсант Ваеннай акадэміі. Да краязнаўчай работы маюць дачыненне, лічы, усе вучні вішоўскай школы. Яны актыўныя ўдзельнікі пошукавых экспедыцый, разам з настаўнікам апытваюць мясцовых жыхароў, робяць даследчыя работы. Асаблівую цікавасць уяўляюць сабой мясцовыя тапонімы. Старажылы расказалі шмат цікавых гісторый і прыгадалі мноства назваў.

— Ёсць, напрыклад, у нас лясок з назвай Паповы штаны, — прыводзіць прыклад суразмоўнік. — Адкуль узялася такая назва? Стаў шукаць і даведаўся пра аднаго разбэшчанага папа, які вёў непрыстойны лад жыцця. І аднойчы сапраўды ў тым лесе страціў штаны.

Асобны раздзел прысвечаны знакамітым ураджэнцам бялыніцкай зямлі, сярод якіх і вучоныя, і афганцы, і ветэраны вайны. Ёсць інфармацыя пра вельмі цікавую асобу. Тым, каму за 40, пра фільм «Маёр Віхар», напэўна, расказваць не трэба. У аснову пакладзена рэальная гісторыя пра групу савецкіх разведчыкаў, якія не далі рэалізавацца намеру Гітлера ўзарваць Кракаў і Прагу.

— Наш зямляк Яўсей Блізнякоў якраз і ўваходзіў у гэтую групу, — расказвае даследчык. — Калісьці ён падарыў школе свой сямейны фотаальбом і пакінуў пакет з просьбай адкрыць яго 1 жніўня 2020 года. Сёлета мы зазірнулі ў яго і знайшлі там кніжку «Я — голас» Яўгена Беразняка, дзе апісваюцца дзеянні Яўсея Блізнякова ў тым атрадзе.

Не менш цікава будзе даведацца аматарам даўніны, адкуль пайшлі назвы населеных пунктаў Вішоўскага сельсавета. Існуе некалькі версій паходжання назвы Вішоў. Адна з іх рамантычная, звязаная з Кацярынай Вялікай. Маўляў, калі тая ехала праз гэтыя мясціны з Санкт-Пецярбурга ў Адэсу, мясцовыя жыхары ў гонар імператрыцы пасадзілі шмат вішнёвых дрэўцаў. Іншая версія, на думку Уладзіміра Чужаўкі, менш праўдападобная. Яму даводзілася чуць, што да назвы нейкім чынам мае дачыненне вялікі князь Вітаўт. Але тут ёсць некаторае несупадзенне. Калі жыў князь, населенага пункта наогул яшчэ не было.

— Усяго ў энцыклапедыі будзе каля 600 паняццяў і шмат ілюстрацый, — кажа Уладзімір Фёдаравіч. — Старых здымкаў, на жаль, мала. Але ёсць і даволі рэдкія, пачатку мінулага стагоддзя.

### ВІШОЎСКІ ДЗЕД МАРОЗ

Уладзімір Чужаўка — не толькі энцыклапедыст, але яшчэ і артыст мясцовага тэатра, які існуе пры Вішоўскім цэнтры культуры і вольнага часу. Прычым артыст з больш чым дзесяцігадовым «стажам»! На сёлетнім міжнародным тэатральным фестывалі-конкурсе «Тэатральная вясна» ў Магілёве, дзе вішоўскі Цэнтр культуры быў адзіны сельскі сярод гарадскіх, калектыў адзначылі як адзін з найлепшых. За час сваёй работы на сцэне Уладзімір Фёдаравіч паспеў сыграць шмат вядучых роляў у спектаклях па такіх творах,



як «Збянтэжаны Саўка», «Мікітаў лапаць», «Прымакі», «Конскі партрэт». Амаль усе спектаклі адзначаны як найлепшыя на ўзроўні раёна, а пастаноўка «Вечар» наогул удастоена Гран-пры. Уладзімір Чужаўка ў гэтым спектаклі атрымаў прыз за найлепшую мужчынскую ролю. «Вечар» — гэта спектакль, дзе іграюць усяго тры артысты — настаўнік і два жывёлавода», — жартуе суразмоўнік. А нядаўна на сцэне Вішоўскага цэнтра культуры і вольнага часу адбылася прэм'ера яшчэ аднаго спектакля — «Без Ягора будзе гора». І хай там гарадскія жыхары не думаюць, што на вёсцы няма ніякага культурнага жыцця. Любімых роляў ва Уладзіміра Фёдаравіча шмат, а вось нязменная адна — Дзед Мароз. І гэты Новы год — не выключэнне.

— Гэтае амплуа я прымераў на сябе яшчэ ў школе, — усміхаецца Уладзімір Чужаўка. — Там хутка зразумелі, што ў мяне горла луджанае, тэкст хутка запамінаю, агульную мову з дзецьмі знаходжу. І пайшло-паехала. У Вішове таксама ніводны Новы год без мяне не абыходзіцца. З 26 снежня пачынаю аб'езд усіх падраздзяленняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# СУМНЫЯ КАЛЯДЫ

## Чаму ў Польшчы азмрочаны зімовыя святы?




**Жыхары Польшчы адлічваюць апошнія «вольныя дзянькі»: улады краіны прынялі рашэнне на тры тыдні ўвесці глабальны жорсткі лакдаўн. Пра гэта заявіў міністр аховы здароўя Адам Нядзельскі. «З 28 снежня да 17 студзеня мы ўводзім нацыянальны каранцін», — заўважыў чыноўнік. Па словах міністра, у гэты перыяд будзе забаронена работа гасцініц (раней яны маглі прымаць гасцей, якія вандруюць па службовай неабходнасці). Спыняецца таксама дзейнасць гарнальыжных схілаў. Усе крамы будуць зачынены, за выключэннем харчовых, гаспадарчых і аптэк. Як патлумачыў Нядзельскі, выйсці можна толькі па істотнай неабходнасці, напрыклад, у аптэку ці на працу. «Трэба заставацца дома», — падкрэсліў міністр. У Новы год увогуле ўводзіцца каменданцкая гадзіна. У «Твітэры» канцылярыі прэм'ер-міністра Матэуша Маравецкага з'явілася паведамленне, што перамяшчэнне з 19.00 31 снежня да 6 раніцы наступнага дня па ўсёй краіне будзе забаронена. Пасля гэтага ў школьнікаў наступяць зімовыя вакацыі. З-за каранціну дзеці да 16 гадоў змогуць выходзіць на вуліцу толькі ў суправаджэнні дарослых. Наступленне ковіду — адна з праяў шэрагу цяперашніх вострых праблем Варшавы. Чаму ў Польшчы азмрочаны зімовыя святы?**

### КОВІД ЗАБІВАЕ ДВОЙЧЫ

У мінулым месяцы па прычынах, не звязаных наўпрост з захворваннем на каранавірус, у Польшчы памерла людзей на 70 працэнтаў больш, чым у лістападзе 2019-га. Справа ў тым, што польская сістэма аховы здароўя не вытрымлівае выпрабаванні COVID-19: на пацыентаў з іншымі хваробамі не хапае рэсурсаў, адзначае rg.ru.

«Ковід забівае двойчы», — так назвалі сваё расследаванне журналісты польскага выдання Dziennik Gazeta Prawna. Са звестак, прадстаўленых ім Нацыянальным фондам аховы здароўя, вынікае, што з пачаткам эпідэміі зменшыліся магчымасці для лячэння захворванняў, звязаных з кардыялогіяй, анкалогіяй, пульманалогіяй. Спецыялісты зафіксавалі на паўмільёна менш зваротаў да кардыёлагаў. Больш за тое, кардыялагічны цэнтр у польскай сталіцы быў пераабсталяваны пад хворых з COVID-19, з прычыны чаго была замарожаная праграма апекі над пацыентамі з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Медыкі б'юць трывогу: з-за апасення заразіцца ковідам людзі ўсё часцей пераносяць інфаркты «на нагах», каб не ісці ў бальніцу. Яшчэ горш ідзе справа з лячэннем захворванняў лёгкіх: колькасць пацыентаў, якім была аказана дапамога ў стацыянары, паменшылася за восем месяцаў на сорак працэнтаў з-за таго, што зараз большасць спецыялізаваных аддзяленняў у шпіталях займаецца наступствамі каранавіруса. Анколагі паведамляюць, што з-за адсутнасці рэгулярных абследаванняў на трацыну менш злаякасных новаўтварэнняў выяўляюць на ранніх стадыях. Па словах медыкаў, усё больш людзей трапляюць сёння ў бальніцы з запушчанымі захворваннямі. Крызіс, выкліканы эпідэміяй каранавіруса, не пашкадаваў і іншыя галіны медыцыны, у тым ліку псіхіятрыю. Але тут колькасць зваротаў да ўрачоў, наадварот, вырасла, а вось аказаць дапамогу няма дзе.

### СПЫНІЦЬ ТРЭЦЮЮ ХВАЛЮ

У Польшчы захоўваецца абвешчаны ўладамі ў сакавіку рэжым эпідэміі. Урад прыняў рашэнне ўвесці ў краіне частковы каранцін: зачыненыя ўстановы культуры, спартыўныя комплексы, грамадзянам рэкамендавана заставацца дома і працаваць аддалена. Па ўсёй краіне ўведзены масачны рэжым, школьнікі вучацца дыстанцыйна, рэстараны, кафэ і бары працуюць толькі навынас. Збірацца ў групах больш за пяць чалавек забаронена.

Па словах міністра аховы здароўя Польшчы, калі не прыняць адпаведныя меры, можа надысці трэцяя хваля эпідэміі, падчас якой сутачны прырост новых хворых будзе дасягаць 40 тысяч. Адам Нядзельскі лічыць, што трэцяя хваля эпідэміі каранавіруса ў краіне рэальная, пра што ён праінфармаваў прэзідэнта і прэм'ер-міністра на пасяджэнні Бюро нацыянальнай бяспекі, паведаміла «Польскае радыё». «Цяпер захворванне складае ў сярэднім 10 тысяч чалавек у дзень. І калі б трэцяя хваля нас захліснула, то гэта прывяло б да велізарных ускладненняў у сістэме аховы здароўя. Гэта тым больш важна таму, што ў лютым-сакавіку назіраецца пік захворвання на грып», — заявіў міністр.

Кіраўнік Канцылярыі прэм'ер-міністра Польшчы Міхал Дворчык паведаміў, што сустрэча ў Бюро нацыянальнай бяспекі была апошнім этапам кансультацый па Нацыянальнай праграме вакцынацыі ад каранавіруса. Пасля дакумент быў прыняты ўрадам. Згодна з праграмай, на першым этапе ў Польшчы будуць вакцынавацца медыкі, пажылыя людзі, прадстаўнікі службаў, якія займаюцца барацьбой



з эпідэміяй, а таксама жыхары дамоў састарэлых і лячэбна-прафілактычных устаноў. Ва ўрадзе Польшчы адзначаюць, што трэба вакцынаваць як мага больш палякаў, каб дамагчыся імунітэту ўсяго насельніцтва краіны.

Ковід, на жаль, працягне наступаць і надалей. Намеснік міністра аховы здароўя Польшчы Вальдэмар Краска ў інтэрв'ю TVP Info заявіў, што пандэмія каранавіруса, хутчэй за ўсё, працягнецца да лета 2021 года. «Па тэхнічных прычынах мы не можам вакцынаваць усіх жыхароў Польшчы на працягу аднаго-двух тыдняў, таму, хоць вакцына і з'явіцца ўжо ў перспектыве аднаго-двух месяцаў, мы будзем жыць у пэўных абмежаваннях да лета: маска, сацыяльная дыстанцыя і дэзынфекцыя», — заўважыў Вальдэмар Краска.

### УРАЧЫ НА РАДЗІМУ НЕ ЗБІРАЮЦЦА

Ліст з пажаданнем хутчэйшага выздараўлення і прапановай дапамогі прэзідэнт Германіі Франк Вальтэр Штайнмаер накіраваў свайму польскаму калегу Анджэю Дуду яшчэ напрыканцы кастрычніка, калі стала вядома, што прэзідэнт Польшчы хворы на каранавірус. Штайнмаер напісаў, што «пандэмія каранавіруса стала для ўсіх цяжкім выпрабаваннем: як для нашых сістэм аховы здароўя, нашых эканомік і адзінства ў нашым грамадстве, так і для кожнага з нас асабіста». У апошнім абзацы ён падкрэсліў, што «там, дзе магчымасці медыцыны дзяржавы дасягаюць мяжы, мы павінны дапамагаць адзін аднаму». Свой ліст прэзідэнт Германіі скончыў просьбай да польскага калегі даць яму знак, калі ў цяперашніх абставінах ФРГ можа нешта зрабіць для Польшчы, і падпісаўся: «Твой Франк».

Германія ўжо аказвае такую дапамогу Чэхіі — туды накіравалі рэспіратары, грамадзяне гэтай краіны лечацца ў нямецкіх шпіталях. Але прэзідэнт Польшчы прапанову Штайнмаера дыпламатычна адхіліў. І хоць яго краіна сапраўды не спраўляецца з крызісам, выкліканым эпідэміяй, рэгіянальныя чыноўнікі ўпрошваюць улады прыняць прапанову ФРГ, а гэтым часам людзі, як паведамляе інфармацыйны партал oko.press, паміраюць у карэтах хуткай дапамогі, паколькі ў шпіталях не хапае месцаў, Дуда ў адказ таксама прапанаваў Штайнмаеру дапамогу.

Як вядома, кіруючая ў Польшчы партыя «Права і справядлівасць» абвінавачвае нямецкія ўлады ў падтрымцы польскай апазіцыі, а падчас выбарчай кампаніі Анджэя Дуды з яго вуснаў гучалі варожыя да Германіі заявы. Нядзіўна, што і ліст Штайнмаера выклікаў у паплечнікаў Дуды незадаволенасць. Адна з дэпутатаў польскага сейма Іаана Ліхоцка выступіла з прапановай, як менавіта ўлады ФРГ маглі б дапамагчы Польшчы: «Няхай нямецкія федэральныя землі на час пандэміі накіруюць у Польшчу ўрачоў, якія працуюць у іх службе аховы здароўя ... А Германія хай фінансуе гэта, дасць нашым суайчыннікам аплатныя адпачынкі на гэты перыяд. Вось у такой дапамозе былі б карысць і сэнс».

Аднак польскія медыкі на радзіму, як высветлілася, не збіраюцца. Напярэдадні польская медыцынская супольнасць ФРГ накіравала кіраўніку прэзідэнцкай кіруючай партыі Яраславу Качыньскаму ліст, у якім было растлумачана, чаму: «У Германіі і Аўстрыі магчымасці атрымання паслядыпломнай спецыялізацыі значна большыя, чым у Польшчы. Акрамя таго, вялікае значэнне мае арганізацыя працы, атмасфера ў краіне пражывання. Ратуючы з поўнай самааддачай здароўе і жыццё пацыентаў, урачы не хочуць, каб іх праследавалі і прыніжалі як прафесійную супольнасць або палохалі пракурорам», — згадала пасланне медыкаў Deutsche Welle.

### «ТАК РАБІЦЬ НЕЛЬГА»

Крокі польскіх улад па барацьбе з пандэміяй выклікаюць крытыку, у тым ліку з боку праваабаронцаў. Рашэнне забараніць перамяшчэнне ў навагоднюю ноч беспадстаўнае і ўяўляе сабой парушэнне грамадзянскіх правоў і свабод. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі польскі амбудсмен Адам Боднар, паведаміла ТАСС. «Так рабіць нельга. Пазбаўленне нас грамадзянскіх правоў і свабод на падставе распараджэння не павінна мець месца, — адзначыў ён, падкрэсліўшы, што падтрымлівае ўрад у барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса. — Аднак калі ўрад выдумляе механізмы абмежавання правоў на друзлых прававых падставах, мой абавязак — выказаць сваю пазіцыю», — адзначыў Адам Боднар.

Раней у эфіры тэлеканала TVN24 прэс-сакратар польскага ўрада Пётр Мюлер, адказваючы на пытанне аб тым, ці будзе паліцыя ў навагоднюю ноч штрафаваць грамадзян, якія выходзяць з дома без вострай неабходнасці, заўважыў, што на падставе распараджэння такая магчымасць будзе.

А між тым, у Польшчы не сціхаюць пратэсты, у якіх бяруць удзел розныя сацыяльныя групы насельніцтва. Напрыклад, актыўна працягваюцца шматтысячныя акцыі фермераў. Як паведамляе мясцовае выданне Dziennik Lodzki, днямі пратэстоўцы на трактарах перакрылі дарогі ў Лодзінскае ваяводства. Арганізатар акцыі — кампанія AGROunia, якая аб'ядноўвае польскіх аграрыяў. «Няхай кіламетровыя пробкі сімвалізуюць бязмерны застой у сельскай гаспадарцы і бесперспектыўнасць. Прэм'ер робіць выгляд, што праблем няма», — адзначаецца ў паведамленні арганізацыі ў Facebook. Па словах фермераў, грошы, якія выплачваюцца аграрыям за агародніну і мяса, ніжэйшыя за рэнтабельныя. У той жа час у супермаркетах Польшчы перад Калядамі цэны растуць.

Калі польскія ўлады па-ранейшаму будуць ігнараваць патрабаванні фермераў, то пасля навагодніх свят аграрыі заблакіруюць дарогі па ўсёй краіне. «Гэта перадкалядны перыяд, таму мы не будзем занадта ўскладняць жыццё. Гэта папярэджанне. Кіроўцы, якія стаяць у заторах, вітаюць нас і кажуць, што разумеюць», — заявілі ў AGROunia.

Перспектывы пакуль зусім не аптымістычныя. Днямі вучоны з аддзялення інфекцыйных захворванняў і гепаталогіі ў тым жа Лодзі прафесар Ганна Пякарская заявіла, што ў яе арганізацыі чакаюць рэзкі ўсплёск колькасці заражэнняў каранавіруснай інфекцыяй у Польшчы ў студзені 2021 года, паведаміў Dziennik. Па словах навукоўца, ужо цяпер у краіне можна назіраць тэндэнцыю паступовага павелічэння колькасці заражэнняў у суткі, хоць яшчэ зусім нядаўна лічба стабілізавалася і трымалася на ўзроўні 5—10 тысяч новых заражэнняў за 24 гадзіны.

«У выпадку захавання такога тэмпу росту колькасці заражэнняў у студзені мы будзем фіксаваць рост колькасці заражэнняў на 70 працэнтаў у параўнанні з бягучым узроўнем. І пакуль няма ніякіх перадумоў, што гэта спыніцца: напярэдадні Каляды і Новы год, людзі будуць дакладна больш актыўна бавіць час разам і выходзіць з дому, чым у звычайныя дні», — заявіла Пякарская. Так што зімовыя святы ў Польшчы трывожныя.

**Пётр ДУНЬКО.**

### ДАСЛОЎНА

## «У польскіх улад няма ні сораму, ні сумлення»

Беларусь ніколі не ўмешвалася ва ўнутраныя справы Польшчы. Аднак пры гэтым ацэнкі польскіх кіраўнікоў адных і тых жа дзеянняў праваахоўнікаў у Польшчы і ў Беларусі вельмі адрозніваюцца. Аб гэтым заявіў карэспандэнту БелТА **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргей РАЧКОЎ.**

«Калі ў Мінску несанкцыянаваныя шэсці паступова губляюць сваю масавасць, то ў суседняй Польшчы, якая так люта не толькі цікавіцца беларускай тэматыкай, але і актыўна ўдзельнічае ў падтрымцы дэструктыўных акцый пэўнай часткі насельніцтва Беларусі, дэманстрацыі супраць дзеянняў польскіх улад захоўваюць сваю сілу і агрэсіўнасць», — падкрэсліў Сяргей Рачкоў.

Пры гэтым ён звярнуў увагу, што польскія праваахоўнікі дзейнічаюць жорстка: затрыманні з выкарыстаннем фізічнай сілы, у тым ліку дэпутатаў, слёзатачывы газ, дубінкі. «Ужо не здзіўляюць рознанакіраваныя ацэнкі польскіх кіраўнікоў адных і тых жа дзеянняў праваахоўнікаў ва ўласнай краіне і ў Беларусі. У нас — гэта неапраўданае прымяненне сілы, гвалт, а ў іх роднай Польшчы — гэта навядзенне і падтрыманне парадку. Як у народзе кажуць, у польскіх улад «няма ні сораму, ні сумлення». Пры гэтым польскія палітыкі напышліва спрабуюць сцвярджаць, што «Польшча ніколі не будзе выглядаць як Беларусь», — адзначыў сенатар.

«Беларусь ніколі не ўмешвалася ва ўнутраныя справы Польшчы. Разлічваем, што ў Польшчы пераможа разумны сэнс, і яна вернецца на шлях канструктыўнага супрацоўніцтва ў духу добрасуседства з нашай краінай», — выказаў меркаванне Сяргей Рачкоў.

# СУЧАСНАЯ ЭНЕРГІЯ І ГІСТАРЫЧНАЕ АДРАДЖЭННЕ

## з'ядналіся ў Ашмянскім краі на шляху да будучыні

**Гальшанскі замак, валун «Нявесцін камень», заказнік «Сухадолы», Дуга Струвэ, мноства таленавітых культурных і гістарычных дзеячаў — зямля Ашмянскага раёна багатая сваёй гісторыка-культурнай спадчынай. Нездарма лінгвісты лічаць, што назва горада пайшла ад літоўскага «ашмянес» — вастрыё, якім была Ашмянская крэпасць, што здаўна спыняла іншаземных захопнікаў. У сучасным свеце ашмянскае вастрыё скіравана на захаванне спадчыны продкаў, актыўнае інавацыйнае развіццё і добрасуседскія адносіны, якія рэалізуюцца ў межах трох праектаў праграм трансгранічнага супрацоўніцтва «Супрацоўніцтва-дзейнасць-будучыня». Чым жыве раён сёння і чаго дасягнуў за апошнія гады, расказала Наталля СТАНКЕВІЧ, намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама па пытаннях адукацыі, культуры, медыцынскага абслугоўвання і сацыяльных пытаннях.**



### Разумнае святло і энергаэфектыўныя садкі

У раёне актыўна праводзіцца работа па энергазберажэнні. Ашмяны сталі адным з чатырох пілотных аб'ектаў Беларусі, якія ўключаны ў праект па Праграме развіцця ААН (ПРААН) «Энергаэфектыўнасць у школах». У 2016-м дзякуючы гэтай праграме старэнькі яслі-сад № 6, створаны яшчэ ў 1986 годзе, атрымаў акрамя сучаснага рамонту геліякалектары, мадэрнізаваны басейн, індукцыйную пліту і параканвектамат. А сёлета ўвосень у межах праекта «Укараненне мерапрыемстваў па энергаэфектыўнасці з мэтай устойлівага энергетычнага развіцця Ашмянскага раёна Беларусі» рэканструявалі ашмянскі яслі-сад № 3, у якім для энергазберажэння рэалізавалі цэлы комплекс прылад: сонечны калектар, фотаэлектрычную сістэму і сістэму рэкуперацыі цяпла.

У 2012 годзе Ашмяны далучыліся да Пагаднення мэраў у Беларусі па клімаце і энергіі, узяўшы абавязак скараціць выкіды парніковых газаў на 20 % да 2020-га. На трэцяй канферэнцыі Пагаднення мэраў, якая прайшла вясной 2019-га, горад прадставіў экалагічныя праекты для самых маленькіх, дзе праз эка-казкі, велапрабегі і вiктарыны расказвалася пра раздзельнае сартаванне смецця і энергаэфектыўныя тэхналогіі.

У красавіку 2020-га ў горадзе ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Далучэнне грамадскасці ў экалагічны маніторынг і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, пачалася ініцыятыва «Павышэнне энергаэфектыўнасці і экалагічнасці сістэмы вулічнага асвятлення г. Ашмяны». Адна з задач экаініцыятывы — замена старых лямпачак вулічнага асвятлення святлодыёднымі і арганізацыя дыстанцыйнага кіравання ўсёй сістэмай праз камп'ютар, устаноўлены ў дыспетчарскай мясцовай ЖКГ.

*— Сёння вуліцы Ашмян асвятляюць 1442 свяцільнікі з энергазатратнымі газаразраднымі лямпамі, запоўненымі ртутнымі парамі. Яны спажываюць 530 тысяч кВт·г у год. У межах ініцыятывы заменяць яшчэ 1316 неэфектыўных свяцільнікаў, што дапаможа сэканоміць 379 тысяч кВт·г у год,* — засяродзіла ўвагу Наталля Станкевіч. — *Гэта дасць значны экалагічны эфект: зніжэнне парніковых газаў на 161 т $CO_2$.*


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Метадыст Ашмянскага раённага цэнтра культуры Сяргей ЖЫЛІК дэманструе «Нявесцін камень».

### Візуалізацыя спадчыны

За апошнія тры гады Ашмяны шмат зрабілі для развіцця турызму. Распрацаваны і ўстаноўлены інфармацыйныя таблічкі з гістарычнымі назвамі на галоўных вуліцах горада. Для павелічэння турыстычнай прывабнасці Ашмян у горадзе ўстанавілі два навігацыйныя слупы з указаннем напрамкаў вуліц і аб'ектаў, а таксама інфармацыйную тумбу, на якой размешчаны звесткі пра гісторыка-культурныя аб'екты і гістарычных асоб, паказана карта Ашмянскага раёна з указаннем месцаў размяшчэння і харчавання.

*— Штуршком у развіцці Ашмянскага рэгіёна ў цэлым стане адкрыццё музея ў Гальшанкім замку, паколькі побач з ім узводзіцца візіт-цэнтр, супрацоўнікі якога будуць прэзентаваць не толькі спадчыну замка, але і расказваць пра ўсю ашмянскую зямлю,* — упэўнена намеснік старшыні. — *У нас распрацаваны комплексны план развіцця турызму на наступны год. Зроблена пэўная работа на месцы гарадзішча, там установяць інфармацыйныя шчыты.*

Для візуалізацыі гісторыі на камені, што знаходзіцца на тэрыторыі Жупранскага сельсавета, і дзе, як кажуць, праходзіў Напалеон, плануюць зрабіць адбітак яго следу (40-га памеру). У кожным сельсавеце абраны пэўныя аб'екты, якія плануецца напоўніць легендамі для прыцягнення турыстаў.

*— Мы канцэптуальна будзем падыходзіць да таго, як выканаць след, а яшчэ стараемся адшукаць подпіс Напалеона, каб таксама ўвасобіць яго,* — удакладніла Наталля Станкевіч. — *Такія дробязі вельмі прыцягальныя.*

Актыўна будуецца жыллё, нядаўна здалі 50-кватэрны дом па вуліцы Барунская і 59-кватэрны дома па вуліцы Заходняя. У чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — крыху больш за 950 чалавек, што для горада, які актыўна расце, не лічба. А калі ёсць, дзе жыць, то і рукі прыкласці месца знойдзецца.

**Ірына СІДАРОК.**

# ГАЛЬШАНСКІ ЗАМАК РЫХТУЕЦЦА ДА СУСТРЭЧЫ ГАСЦЕЙ

**Сустракаць першых турыстаў у былой рэзідэнцыі Сапегаў спадзяюцца ў хуткім часе. У замку будуць свае ключніца і кіраўнік, а ў сутарэннях «паселяцца» прывіды. На першым паверсе Паўночнай вежы, дзе неўзабаве адкрыецца музей, размесцяцца рэчы, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак. Яго адметнасцю стане вялізны камін і фрагменты гістарычнай падлогі. Гэты ўзровень уяўляе сабой парадную частку замка. На трэцім паверсе арганізавана аглядная пляцоўка, адкуль можна будзе палюбавацца краявідамі.**



На прызамкавай тэрыторыі за некалькі гадоў зроблены новыя святлодыёдныя ліхтары і дэкаратыўная падсветка ўздоўж алеі ў выглядзе невялічкіх слупкоў з ажурнай гравіроўкай. З'явілася маштабная аўтастаянка, якая можа прыняць як легкавікі, так і вялізныя аўтобусы. Шмат выканана работ на навакольнай тэрыторыі, праведзена мноства супрацьаварыйных і кансервацыйных работ у самім замку, расказаў **Сяргей ЖЫЛІК, метадыст Ашмянскага раённага цэнтра культуры:**

*— Паўночная вежа захавалася лепш за ўсё, таму з яе і пачалася рэстаўрацыя. Для доступу ў замак зроблена лесвіца, з якой можна трапіць на кожны паверх. Гістарычная візуалізацыя аб'екта — цяжкая справа, бо асобныя дэталі выявы захаваліся літаральна ў нейкіх фрагментах. Калі шукалі, як выглядаў замак у 1610 годзе, высветлілася, што дакладных яго выяў не захавалася. Насамрэч замак значна большы, чым выглядае цяпер — частка фундамента дагэтуль знаходзіцца ў зямлі для найлепшага захоўвання.*

Усе вонкавыя работы па аднаўленні Паўночнай вежы ўжо зроблены: гідраізаляцыя фундамента, умацаванне кладкі сцен, іх тынкоўка, сталярныя работы, зроблена падсветка. Рэканструкцыю рабілі, выкарыстоўваючы аўтэнтычную цэглу. Месцамі захавана і гістарычная плітка падлогі.

Паўночна-ўсходні корпус замка — фрагмент, які таксама захаваўся досыць добра. У перспектыве — правядзенне там кансервацыйных і супрацьаварыйных работ, а таксама аднаўленне замкавай сажалкі.

**Ірына СІДАРОК, фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# Дзіцячы сад, які сілкуецца сонцам

**Сваё 50-годдзе Ашмянскі яслі-сад № 3 сустрэў сёлета не проста цалкам абноўлены звонку і ўнутры, а яшчэ і далучаны да найноўшых тэхналогій, якія «сябруюць» з прыродай. Першыя выхаванцы (былыя і новыя) апрабавалі новы будынак, рэканструкцыя якога абышлася больш як у пяць мільёнаў рублёў, ужо ў лістападзе.**



Сонечныя батарэі на даху ясляў-сада.

Сучаснае энергазберагальнае начынне садка дазваляе спажываць удвая менш энергіі і эканоміць каля 100 тон $CO_2$. Тут устанавілі індукцыйную пліту і параканвектамат. Дзякуючы сонечнаму калектару і цеплапомпам абаграваецца будынак і падаграваецца вада. Калі сонца недастаткова, сістэма цеплазабеспячэння аўтаматычна падключаецца да кацельнай ЖКГ. А сонечныя панэлі забяспечваюць садок электрычнасцю. У добрае надвор'е вада награваецца да 80 °С, а анціфрыген, якім запоўнены сонечныя панэлі, ахалоджвае празмерны градус. Тэмпература вады ў кране выстаўлена на 27 °С з сямі да пяці вечара, тэмпература ў батарэях — 44,7 °С.



Загадчык ясляў-сада Таццяна БІЗУКОЙЦЬ з дзецьмі ў групе.

Сістэма вентыляцыі з рэкуперацыяй цяпла падагравае марознае паветра з вуліцы, перш чым яно трапіць у групы, і не дае цяплу сысці з пакояў — усё зроблена, каб захаваць здароўе дзетак. Для гэтага ж існуе і сучасны медыцынскі блок, дзе малыя, якія часта хварэюць, могуць аздаравіцца з дапамогай біяптрона, магнітнага выпраменьвальніка ды інгалятара.

А яшчэ ў дзіцячай установе з'явіліся, напрыклад, асобныя спальні замест памяшканняў, якія сумяшчаліся з гульнявымі пакоямі.

*— Наш садок перабудавалі цалкам. Нават педагогі, якія ў ім працавалі да мадэрнізацыі, пакуль яшчэ блукаюць. А дзеці дык першыя часы пыталіся, ці прыйдуць яны ў садок заўтра, або толькі часова тут, бо многія год чакалі, каб вярнуцца сюды, пакуль ішла рэканструкцыя,* — смяецца **загадчык ясляў-сада № 3 горада Ашмяны Таццяна БІЗУКОЙЦЬ.** — *З'явілася спартзала, пад якую раней быў прыстасаваны групавы пакой. У кожным групавым пакоі ёсць бактэрыцыдная лямпа, а ў раздатачных — стэрылізатары для посуду.*

Акрамя звычайных груп, у садку дзве спецыяльныя групы. У кожнай з іх з дзеткамі працуюць па два выхавацелі і настаўнік-дэфектолаг.

*— Кожнаму выхаванцу патрэбны індывідуальны падыход: педагог і дзіця адзін на адзін,* — кажа **Ірына ГАРЛУКОВІЧ, выхавацель ясляў-сада № 3.** — *Ёсць дзеці, дыягназ якіх дазваляе ім асвоіць толькі базавыя сацыяльныя навыкі, і ім лепш у спецгрупах.*

Да рэканструкцыі ў садку-юбіляру было 11 груп — цяпер шэсць; дзяцей сюды хадзіла 205 — цяпер будынак разлічаны на 110 малых, і ім ёсць дзе разгарнуцца ва ўсіх праявах дзіцячага імпэту.

**Ірына СІДАРОК, фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# ДЭМАГРАФІЯ ПА-ГАЛЬШАНСКУ

**Сельскі дзіцячы сад на 55 месцаў — сама па сабе з'ява для Беларусі не вельмі звычайная. На Ашмяншчыне пахваліцца такімі буйнымі памерамі на вёсцы могуць толькі Гальшанскія яслі-сад. Больш за тое, у рэальнасці сюды ходзяць 80 дзетак з Гальшан і васьмі найбліжэйшых вёсак, адкуль малых прывозіць аўтобус гальшанскай сярэдняй школы.**

У апошнія гады тэндэнцыя на змяншэнне колькасці малых не назіраецца. Наадварот, штогод дзетак усё больш, таму трэба думаць над расшырэннем, смяецца **Ганна КАВАЛІЦКАЯ, загадчык ДУА «Гальшанскі яслі-сад»**. Пры гэтым у садку ёсць музычная і спартыўная залы, кабінет дэфектолага, псіхолага і нават «беларуская хатка» і жывы куточак з чарапашкай ды рыбкамі.

Здаецца, што «перанаселенасць» натхняе яшчэ больш тварыць. Дашкольная ўстанова займае прызавыя месцы на разнастайных выставах, куды прывозіць сапраўдныя скарбы, якія амаль цалкам усе зроблены рукамі педагогаў. Выглядаюць матэрыялы для заняткаў з мале



Загадчык ДУА «Гальшанскі яслі-сад» Ганна КАВАЛІЦКАЯ.

чай вельмі прыгожа. Разнастайныя лэпбукі з акенцамі, канверцікамі ды кішэнькамі, кнігі ў ільняных вокладках, самаробныя выданні з казкамі... І тэматыка, акрамя казачнай, самая розная: здаровае харчаванне, фальклор, рэцэпты страў беларускай кухні, вандроўкі ў цудоўны свет лялек.

— З 2015-га да 2019-га мы працавалі ў рэжыме рэспубліканскай інавацыйнай пляцоўкі «Укараненне мадэлі патрыятычнага выхавання ва ўмовах дашкольнай установы». За гэты час зрабілі шмат метадычных дапаможнікаў і распрацовак. Аднак паколькі мы знаходзімся ў гістарычнай мясціне, дзіцячы сад больш за ўсё займаецца культуралагічным кірункам, — хваліцца загадчык і мае рацыю. — Нашы педагогі вельмі таленавітыя. Яны стварылі сапраўды багатую прадметна-развіццёвую базу. У нас ёсць цікавыя кнігі з казкамі на фетры, кнігі ў скрыначках. Нядаўна скончылі такую скрыначку з экалагічнымі казкамі.

Працоўны калектыў тут не толькі творчы, але і нязменны. З моманту адкрыцця садка ў 1978 годзе як прыйшлі пяць выхавацеляў па размеркаванні, так тут і засталіся. Што ні кажыце, а калі сваё месца знайшоў, то і прырастаеш да яго, і ствараеш бясконца.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота Яна ХВЕДЧЫНА.**



# «ВЯСЁЛЫ ЖУЖА» — СЦЕЖКА НА «ЕЎРАБАЧАННЕ»

**Выява працавітага чмяля першапачаткова была афіцыйнай эмблемай Гальшанскай дзіцячай школы мастацтваў. Пазней на ўваходзе ў будынак з'явіўся жартаўлівы чмель, які стаў талісманам і для школы, і для фестывалю-конкурсу для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту "Вясёлы Жужа", які праходзіць у аграгарадку Гальшаны апошнія пяць гадоў.**



Дарэчы, выканаў Жужу, які з лёгкасцю заваяваў сэрцы маленькіх і дарослых прыхільнікаў, качагар школы літаральна з падручных матэрыялаў. Але ж такога абаяння і заліхвацкага выгляду вы не знойдзеце ні ў воднай моднай статуэтцы з крамы. Гэта яшчэ адзін доказ таго, што рэчы, якія зроблены з душой, і жывуць даўжэй, і прыносяць больш радасці.

На конкурсе хлопчыкі і дзяўчынкі прадстаўляюць свае творчыя здольнасці ў чатырох намінацыях: вакальны жанр, выяўленчае мастацтва, мастацкае слова і інструментальны жанр. Нават у сёлетні год пандэміі «Вясёлы Жужа» атрымаў 510 відэаролікаў ад канкурсантаў. Аўтарытэтнае журы прызнала пераможцамі ўсіх без выключэння ўдзельнікаў фестывалю.

— Конкурс дае магчымасць самым маленькім далучыцца да мастацтва, паспрабаваць свае сілы, а таксама сустрэць сяброў. А яшчэ тутэйшае мерапрыемства становіцца стартавай сцежкай на дзіцячае «Еўрабачанне», — смяецца **дырэктар школы Наталля ЯЛФІМАВА.** — Людзі едуць сюды за атмасферай, бо да ўсіх канкурсантаў добразычлівае стаўленне, кожнага ўдзельніка заахвочваюць, кожнаму дораць увагу і салодкія падарункі, а таксама кубкі, статуэткі і дыпломы.

За час існавання Гальшанскай дзіцячай школы мастацтваў 25 вучняў станавіліся стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота Яна ХВЕДЧЫНА.**





# Смачна есці!

## ААТ «АШМЯНСКІ МЯСАКАМБІНАТ» віншуе з Новым годам і Калядамі!

***Спрадвеку навагодняе і каляднае застоллі непарыўна звязаны з сямейным цяплом, душэўнай кампаніяй і... мяснымі далікатэсамі. Клапаціцца пра сваіх блізкіх — значыць, выбіраць для іх самае лепшае, цікавіцца, дзе і ў якіх умовах выраблены мясныя прадукты, што мы выбіраем для нашага стала. Бяспечнасць і выдатны смак кожнага з соцень відаў мясных вырабаў — галоўны клопат калектыву ААТ «Ашмянскі мясакамбінат».***



Наш слоган і прынцып работы — «З павагай да якасці»! Менавіта таму на кожным этапе вытворчасці мяснай прадукцыі на прадпрыемстве ажыццяўляецца кантроль сыравіны, рэжымаў тэхналагічных працэсаў, умоў захоўвання, транспарціроўкі і рэалізацыі. Дзякуючы нястомнай працы па кантролі якасці ашмянскія вэнджаніна, сыравяленыя, сыравэнджаныя і вараныя каўбасы, вяндліна і мясныя паўфабрыкаты, сасіскі і сардэлькі — сапраўды смачныя і карысныя для здароўя.

Кажуць, аб густах не спрачаюцца. Замест гэтага — спрабуюць і атрымліваюць асалоду! Багаты асартымент прадукцыі ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» дазваляе кожнаму знайсці мясны выраб на свой густ. Сёння прадпрыемства прапануе спажыўцам больш за 200 відаў прадукцыі — каўбасныя вырабы, паўфабрыкаты, мяса (высакаякасная свініна і ялавічына). Для захоўвання іх свежасці і выдатных смакавых якасцяў выкарыстоўваюцца сучасныя віды вакуумнай і газавай упакоўкі. Мы клапатліва прапануем гаспадыням зручную фасоўку мясных вырабаў.

Пакупнікі сцвярджаюць, што нашы мясныя прысмакі — сапраўдныя шэдэўры кулінарнага мастацтва. За апошнія гады на прадпрыемстве ўзраслі аб'ёмы прадукцыі, значна павялічылася рэалізацыя. Сапраўдны мясны смак каўбас з Ашмян — гэта смак дзяцінства! Нашы прыярытэты — вернасць нацыянальным кулінарным традыцыям плюс сучасная высокатэхналагічная вытворчасць.



У 2020 годзе ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» адзначыў свой 120-ы дзень нараджэння. Вось нашы сакрэты поспеху:

***Сакрэт першы:* «З павагай да якасці!»**
Вытворчы працэс ажыццяўляецца на аснове міжнародных сертыфікатаў якасці і бяспечнасці прадукцыі.

***Сакрэт другі:* перадавыя тэхналогіі.**
Мясакамбінат увайшоў у Дзяржаўную праграму па пераасна-шчэнні прадпрыемстваў мяснoй галіны, таму ўсё абсталяванне ў нашых цэхах новае і сучаснае.

***Сакрэт трэці:* новыя рынкі.**
Значная частка прадукцыі Ашмянскага мясакамбіната рэалізуецца за межы Беларусі. Мы вырабляем канкурэнтаздольны тавар і адчуваем сябе ўпэўнена як на ўнутраным, так і на знешнім рынку.

***Сакрэт чацвёрты:* фірменны гандаль.**
Сетка фірменных крам Ашмянскага мясакамбіната «Пачастунак» паспяхова пазіцыянуецца на харчовым рынку краіны ўжо не першы дзясятак гадоў. З кожным годам яна пашыраецца дзякуючы адкрыццю новых гандлёвых пунктаў.

***Сакрэт пяты:* каманда прафесіяналаў.**
За любімі дасягненнямі заўсёды стаяць людзі, неабыякавыя да справы, якой яны прысвяцілі жыццё. Дзякуючы згуртаванаму калектыву прафесіяналаў ашмянскія мясныя вырабы карыстаюцца нязменным попытам у спажыўцоў.

УНП 500057139



*Мясная прадукцыя ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» стане ўпрыгажэннем вашага навагодняга стала. Адкрыйце для сябе і сваіх блізкіх незабыўныя якасць і смак мясных прадуктаў з Ашмян! Смачных вам святаў! Шчасця і радасці ў надыходзячым годзе!*





# НЯМА ДАРОГІ — ПРАЛАЖЫ ЯЕ САМ

## Упарадкаваныя «кіламетры» ашмянскіх дарожнікаў

Дырэктар «ДБУ № 28» Дзмітрый ШМАТ.

**Зрабіць дарогу, забяспечыць яе якасным пакрыццём, аўтастаянкамі, аб'ектамі прыдарожнага сэрвісу, арганізаваць пешаходныя дарожкі, зрабіць масты? З лёгкасцю! Усе гэтыя і шмат іншых задач, якія могуць паўстаць падчас стварэння трасы і яе інфраструктуры, за 50 гадоў работы бездакорна навучыліся выконваць спецыялісты Ашмянскага ДБУ № 28, якія разумеюць, што камфортная, бяспечная і хуткая дарога — патрабаванне сучаснасці.**



На будаўнічых работах.

## БУДАЎНІЦТВА, РЭКАНСТРУКЦЫЯ, ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

У пачатку свайго станаўлення прадпрыемства, якое было створана 2 кастрычніка 1970 года як ДБР-28, не мела нават уласнай базы і месцілася на тэрыторыі ДЭУ-833. Праз сем гадоў у дарожнікаў з'явіліся вытворчая база, інтэрнат для супрацоўнікаў, стаянка для машын. А ў 1981-м ДБР-28 перайменавалі ў ДБУ-28.

Сёння ў прадпрыемства не толькі развітая база з адміністрацыйна-бытавым корпусам, а і рамонтныя майстэрні са складскімі памяшканнямі і гаражамі, склад гаруча-змазачных матэрыялаў, прырэйкавая база чыгуначнай станцыі Солы. І нават уласны асфальтабетонны завод, дзе вырабляюць сумесі для асфальтабетонных пакрыццяў дарог.

Аднак галоўнае багацце арганізацыі — амбіцыйны рабочы калектыў, спецыялісты якога не толькі дарожнікі, але і аўтамабілісты, і будаўнікі, упэўнены **дырэктар Ашмянскага ДБУ № 28 — філіяла Дарожна-будаўнічага трэста № 6 Дзмітрый ШМАТ:**

— У нас працуюць 123 прафесіяналы, якія імкнуцца паспяхова выконваць любыя работы па будаўніцтве дарог і добраўпарадкаванні тэрыторыі. Людзі скіраваны на якасную працу, бо ад гэтага залежыць прэстыж арганізацыі. З кожным годам разам з прафесіяналізмам нашых работнікаў растуць і іх вопыт, і, адпаведна, узровень аб'ектаў, якія нам давяраюць.

На працягу 50 гадоў ашмянскія стваральнікі шляхоў збудавалі 1184 кіламетры дарог, пяць аўтамабільных мастоў агульнай працягласцю 145 метраў, добраўпарадкавалі сотні квадратных метраў у мястэчках і ўздоўж трас, стварылі разнастайныя аб'екты прыдарожнага сэрвісу. Пры гэтым дарожнікі не проста будуюць аб'екты, а яшчэ займаюцца іх капітальным і бягучым рамонтам.

Працавалі ашмянскія майстры дарожнай справы не толькі дома, але і за межамі краіны. У 90-х гадах мінулага стагоддзя працавалі нават у Калінінградскай вобласці Расіі, а ўжо пра суседнія раёны і казаць няма чаго.

Сярод аб'ектаў, якімі можна па праве ганарыцца, участак дарогі Мінск — Вільнюс ад Валожынскага раёна (Мінская вобласць) да мяжы з Літвой і дэмаркацыйныя ўчасткі дарог на мяжы Ашмянскага раёна з Літвой. Пад'язны шлях Р52 да будуемай БелАЭС, у тым ліку паўднёва-ўсходні абход Астраўца з выхадам на трасу М7, а таксама асфальтаванне ўнутраных праездаў на тэрыторыі самой АЭС непасрэдна вакол рэактара.

Сярод буйных аб'ектаў ашмянскіх дарожнікаў і рэканструкцыя аўтадарогі М6 Мінск — Гродна — граніца з Рэспублікай Польшча (пункт «Брузгі»), удзел у будаўніцтве 2-й Мінскай кальцавой дарогі. А літаральна ў канцы лета завяршылі першы пускавы комплекс аб'екта «Рэканструкцыя праспекта Індустрыяльны ў межах СЭЗ «Гроднаінвест».

Сёлета свае клапатлівыя і ўмелыя рукі ашмянскія будаўнікі-дарожнікі прыкладаюць, напрыклад, на аб'екце «Квартал індывідуальнай жылой забудовы мікрараёна «Паўднёвы» ў Ашмянах. Робяць бягучы рамонт трасы М6/Е28 Мінск — Гродна — граніца з Рэспублікай Польшча і дарогі М6 «Пад'езд да аэрапорта «Гродна». Рэканструююць чыгуначны мост праз Нёман пад аўтамабільны з транспартнымі падыходамі (вуліца Южная — вуліца Карскага) у Гродне.

## І ПРЫБЫТАК, І АЎТАРЫТЭТ

Не толькі дарогі, але і пад'язныя шляхі, тратуары, пешаходныя сцежкі, праезды, укладка пліткі і нават устройства каналізацыі — усё гэта робяць спецыялісты прадпрыемства.

— У нас ліцэнзіі на ўсе работы, жыццё прымусіла навучыцца, — смяецца кіраўнік ДБУ. — Мы добраўпарадкуем таксама і тэрыторыі прадпрыемстваў. Летась працавалі на крухмальным заводзе, сёлета — на Ашмянскім мясакамбінаце і сыраробным заводзе. У суседзяў з Астраўца ў межах інвестпраграмы па развіцці інфраструктуры горада рэканструюем цэнтральную вуліцу Валадарскага, здаць якую запланавана налета. Заканчваем участак пад'язной дарогі да водазаборных збудаванняў атамнай станцыі.

Дырэктар на практыцы ведае ўсе прыступкі дарожнай справы. Прыйшоў у будаўніча-дарожную галіну ў 1999-м і прайшоў шлях ад майстра да кіраўніка арганізацыі і ўдзельнічаў у стварэнні аб'ектаў, лічы, па ўсёй Гродзенскай вобласці.

Здавалася б, работа дарожнікаў сезонная, і ўзімку павінна быць зацішша, аднак у сувязі з цёплым надвор'ем летась, напрыклад, працавалі стабільна ўвесь год.

— У лістападзе—снежні 2019-га аб'ёмы работ былі нават вышэйшыя, чым летам, бо быў заказ. Хацелася б большага, але зараз няма фінансавых магчымасцяў, — дзеліцца дырэктар. — Увогуле, буйныя аб'екты прыносяць не толькі прыбытак, але і аўтарытэт. А калі шмат дробных, то прыходзіцца распыляць свае сілы. Гэта і частая перавозка тэхнікі, і павелічэнне сабекошту работ, што ў выніку памяншае суму прыбытку.

Тым не менш, прадпрыемства працуе зладжана, тым больш што знаходзіцца цалкам на гаспадарчым разліку, а вынік, як тут кажуць, «не на выдатна, але ж і не дрэнна, справа спорыцца». Сёлета вось з прыбытку (а гэта амаль 650 тысяч рублёў) набылі за 460 тысяч гладкі вальцовы каток для зацвярдзення асфальту. Цяпер ДБУ-28 мае самы магутны і цяжкі каток у Гродзенскай вобласці і гатовае да яшчэ больш складаных і вялікіх аб'ектаў.

— Са спецыялістамі заўжды камфортна працаваць, — падкрэслівае Дзмітрый Шмат. — А прафесіяналаў у нас хапае, прычым многія настолькі таленавітыя ў сваёй справе, што такіх трэба яшчэ пашукаць. Ёсць у нас, напрыклад, два выдатныя бульдазерысты Уладзімір Садоўскі і Сцяпан Лаўрыновіч, машыніст экскаватара-планіроўшчыка Сяргей Пракаповіч, машыністы ўкладчыка асфальтабетону Аляксандр Ермаковіч і Алег Ігнаценка. Апошні сёлета быў удастоены звання «Ганаровы дарожнік Рэспублікі Беларусь» II ступені. Галоўны інжынер Пётр Гудзебскі «вырас» у арганізацыі да гэтай пасады ад дарожнага рабочага. Увогуле касцяк нашага прадпрыемства — людзі, якія працуюць тут дзесяць гадоў і больш.

Багатая арганізацыя не толькі на прафесійныя і працавітыя кадры, але і на цэлыя дынастыі: Лісоўскіх, Завадскіх, Лакуцієўскіх, Шмат, Белавус-Данісевічаў. У працоўнай скарбонцы бацькі і сына Федаровічаў, напрыклад, больш як 35 гадоў стажу. Віктар працуе машыністам змешвальніка асфальтабетону, а яго сын Аляксандр — старшым майстрам асфальтаўкладкі. Бацька і сын Сінкевічы ў ДБУ на дваіх маюць ужо ледзьве не паўстагоддзя. 36 з лішкам гадоў Казімір Сінкевіч, які мае званне «Ганаровы дарожнік», працуе вадзіцелем пагрузчыка, а яго сын Станіслаў больш за дзесяць гадоў узначальвае рамонтна-механічную майстэрню.

Сам дырэктар сёлета таксама атрымаў званне «Ганаровы дарожнік Рэспублікі Беларусь», а значыць, калектыў на правільным шляху. Датычныя да дарожнай галіны ведаюць, што кожны метр дарогі — гэта вялікія праца, адказнасць і прафесіяналізм. Бо ў любое надвор'е дарога павінна не толькі надзейна злучаць паміж сабой гарады і пасёлкі Беларусі, але і дапамагаць людзям бяспечна вандраваць.



Супрацоўнікі «ДБУ № 28» *(злева направа)*: Людміла АПАЛОНІС, Алена ШМАТ, Алена НОЖКА, Алена РЫНКЕВІЧ, Міраслава-Ганна АСІНСКАЯ, Алена ФЕАКЦІСАВА.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

УНП 500217663.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **27 января 2021 г. в 11.00<br>аг. Занарочь, ул. Октябрьская, д. 3, каб. 1,<br>Занарочский сельский исполнительный комитет** |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов** | **аг. Занарочь, ул. Октябрьская, д. 3, каб. 1,<br>Занарочский сельский исполнительный комитет,<br>тел. (8-01797) 36-1-35, тел./факс (8-01797) 36-1-35.<br>С момента опубликования извещения<br>до 15.00 25 января 2021 г.<br>В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** |
| **Порядок осмотра земельных участков на местности** | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| **Условия проведения аукциона** | Наличие не менее двух участников |
| **Продавец** | Занарочский сельский исполнительный комитет |
| **Организатор аукциона** | Занарочский сельский исполнительный комитет:<br>**аг. Занарочь, ул. Октябрьская, д. 3, каб. 1,<br>тел. (8-01797) 36-1-35, тел./факс (8-01797) 36-1-35** |
| **Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе** | Размер задатка: 10 % от начальной цены.<br>Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации.<br>Реквизиты: р/с BY79AKBB36006230319080000000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНН 600097408, код платежа – 04901 |

| | |
|---|---|
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне. |

| ЛОТ № 1 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в аг. Занарочь, ул. Лесная, уч. № 14, площадью 0,2404 га (кадастровый номер 624081403601000251). Земельный участок расположен на расстоянии 400 метров от озера Нарочь.<br>**Начальная цена – 6 000 (шесть тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,2404 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Электрические сети.<br>Имеется возможность газификации |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего 312 руб. 00 коп., в том числе:<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 312 руб. 00 коп. |
| **Дополнительно** | О возмещении затрат в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» - возмещение не требуется |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

| Наименование | Общая площадь, кв. м | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Производственный корпус** | 1130,5 | 500/С-49698 | 16 |
| **Диспетчерская** | 54,7 | 500/С-53818 | 16/12 |
| **Здание специализированное иного назначения (литейный цех)** | 7664,8 | 500/С-47329 | 16 |
| **Производственный корпус** | 4340,5 | 500/С-53224 | 16/1 |
| **Компрессорная** | 473,6 | 500/С-54017 | 16/15 |
| **Электропечь термическая** | 39,8 | 500/С-54018 | 16/16 |
| **Здание весовой** | 24,3 | 500/С-54019 | 16/17 |
| **Административно-хозяйственный корпус** | 2323,4 | 500/С-49697 | 16/23 |
| Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановый путь, дорожки, подпорные стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница | | | |
| **Склад** | 2328,4 | 500/С-53297 | 16/2 |
| **Склады** | 895,5 | 500/С-53808 | 16/8 |
| **Склады, гаражи** | 453,6 | 500/С-53897 | 16/9 |
| **Склады, административные помещения, агрегатные** | 563,7 | 500/С-53846 | 16/10 |
| **Инженерный корпус** | 3348,6 | 500/С-46093 | 16 |
| **Административно-производственный корпус № 4** | 19710,5 | 500/С-53638 | 16/3 |
| **Склад** | 2193,5 | 500/D-708019487 | д.16 п.2 |
| **Строительный цех** | 507,9 | 500/С-53845 | 16/11 |
| **Насосная станция автоматического пожаротушения** | 194,4 | 500/С-54016 | 16/14 |
| **Станция очистки сточных вод** | 305,1 | 500/С-54015 | 16/13 |
| **Градирня** | 39,1 | 500/С-55130 | 16/18 |
| **Ливневая канализационная сеть** | 1077,5 м | 500/С-1029279 | 16 |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 973,2 м | 500/С-1029266 | |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 764,5 м | 500/С-1029275 | |
| **Тепловая сеть** | 236,7 м | 500/С-1029272 | |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), кабельные телеф. сети (инв. № 12030041), оборудование РП-2 (инв. № 13041207), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13040254, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), пульт распределит. (инв. № 13040780), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040076, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсатная установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты грузовые (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности (деревья 10 шт., газоны 10 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых материальных историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 20 870 640,43 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Производственный корпус № 2** | 9 755,90 | 500/С-53630 | 16/5 |
| Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановые пути, дорожки, подпорные стены, бордюр 0,16, ограждения, ворота | | | |
| **Ливневая канализационная сеть** | 122,3 м | 500/С-1029278 | 16/5 |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 305,6 м | 500/С-1029274 | |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 133,3 м | 500/С-1029268 | |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040142, 13040219), комплектное РУ (инв. № 13040018), силовой трансформатор (инв. № 13041176Д), комплект. ТП (инв. № 13040047), конденсат. установки (инв. № 13040314, 13040308, 13040550, 13040231, 13040248), ТП (инв. № 13040107), электросил. трансформатор (инв. № 13041176), агрегат выпрямит. (инв. № 13050608), объекты растительности (деревья 14 шт., газоны 4 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для производства машин и оборудования (машиностроения) на праве временного пользования пл. **1,9448 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охранных зонах электрич. сетей (пл. 0,0476 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,3316 га), канализации (пл. 0,0191 га), теплоснабжения (пл. 0,1005 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0432 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 260 166,29 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Заводоуправление** | 2763,5 | 500/С-53298 | 16/4 |
| Составные части и принадлежности: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры | | | |
| **Производственный корпус** | 13365,7 | 500/С-45217 | 16/24 |
| **Технологическая котельная** | 200,30 | 500/С-53824 | 16/7 |
| **Тепловая сеть** | 43,8 м | 500/С-1029271 | 16/4 |
| **Ливневая канализац. сеть** | 547,1 м | 500/С-1029280 | |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 161,3 и 169 м | 500/С-1029273, 500/С-1029277 | |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 68,4 и 295,1 м | 500/С-1029269, 500/С-1029267 | 16 |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), каб. телеф. сети (инв. № 12030035), комплект.ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. № 13040294, 13040283, 13040171), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040202), объекты растительности (деревья 13 шт., газоны 2 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения: 1) на праве временного пользования пл. **1,94 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зона линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвижимых материальных историко-культурных ценностей (пл. 0,3730 га); 2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 18 619 054,40 бел. руб.** | | | |

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентар. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1), 500/С-53298 (лот № 3) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

В соответствии с градостроительным проектом детального планирования на земельных участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекательного, выставочно-музейного, музейно-просветительского назначения, многоуровневой автостоянки.

На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

